ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 9 (2062)
28 студзеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

З мэтай далейшага развіцця літаратуры і мастацтва ў рэспубліцы Савет Міністраў БССР устанавіў Дзяржаўныя прэміі БССР за выдатныя творы літаратуры, мастацтва і выканаўчае майстэрства.

Усяго ўстаноўлена 6 Дзяржаўных прэмій, памерам 2.500 рублёў кожная, у тым ліку: за творы прозы і літаратуразнаўчыя работы—адна прэмія імя Я. Коласа; за творы паэзіі і драматургіі—адна прэмія імя Я. Купалы; за творы жывапісу, скульптуры, графікі, манументальна-дэкаратыўнага і прыкладнога мастацтва—адна прэмія; за музычныя творы вялікіх і малых форм, а таксама выдатную канцэртна-выканаўчую дзейнасць—адна прэмія; за работы рэжысёраў, балетмайстраў, хормайстраў, артыстаў і мастакоў у пастаноўцы фільмаў і спектакляў—дзве прэміі.

Дзяржаўныя прэміі БССР могуць прысуджацца таксама за даследчыя і крытычныя работы ў галіне выяўленчага, музычнага, тэатральнага мастацтва і кінематаграфіі.

Першае прысуджэнне прэмій будзе праведзена за творы і работы, створаныя ў 1965 годзе.

Асобам, удастоеным Дзяржаўных прэмій БССР, прысвойваецца званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, уручаюцца ганаровы знак і дыплом.

Прадстаўленне твораў і работ да Дзяржаўных прэмій БССР робіцца ў камісію па Дзяржаўных прэміях БССР да 20 красавіка міністэрствамі і ведамствамі БССР, творчымі саюзамі і таварыствамі, рэспубліканскімі камітэтамі прафсаюзаў, рэдкалегіямі часопісаў і газет, кніжнымі выдавецтвамі, абласнымі грамадскімі арганізацыямі, навукова-даследчымі інстытутамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, сходамі працоўных.

Творы і работы, прадстаўленыя на атрыманне Дзяржаўных прэмій, павінны шырока абмяркоўвацца да прысуджэння прэмій.

Савет Міністраў БССР зацвердзіў камісію па Дзяржаўных прэміях БССР, на якую ўскладзены абавязак папярэдняга разгляду твораў і работ, прадстаўленых на атрыманне прэмій, і ўнясення ў Савет Міністраў БССР прапаноў па прысуджэнню Дзяржаўных прэмій БССР.

БЕЛТА.



АДРАС МУЗЕЯ— МІНСК, БІРУЗОВА, 13

Прадбачым пярэчанні:
— Няма па гэтаму адрасу музея...

І ў знак доказу — адрасная кніга. Адгорнута на слове «музей». Сапраўды, па такому адрасу музей не значыцца...

А музей там, між тым, ёсць. Багаты, цікавы, са сваім абліччам. Варты таго, каб пра яго ведалі...

Урэшце, не будзем гуляць у таямніцы. Гаворка ідзе пра музей 16-й школы.

Адразу агаворымся: школьны музей зусім нярэдкая з'ява ў рэспубліцы. Калі не музей, дык, прынамсі, музейны куток — ленінскі, гістарычны, мастацкі — ёсць амаль што ў кожнай дзесяцігодцы. Але ўспомніце многія з іх — як лёгка можна іх перакінуць са школы ў школу, нават з раёна ў раён. Аблічча іх такое агульнае, так пазбаўлена свайго, непаўторнага, што здаецца — не самі настаўнікі і дзеці рабілі і збіралі музей, а атрымалі яго гатовы, як атрымліваюць камплекты вучэбных дапаможнікаў.

Іншае — музей 16-й школы. Бяру на сябе смеласць сцвярджаць: такога, як тут, больш на свеце не існуе. Ёсць багацейшыя ці бяднейшыя, цікавейшыя ці сумнейшыя, але такога — няма. І ў гэтым найпершая яго каштоўнасць.

Дырэктар школы Я. І. Якубоўскі—гісторык. І часта праводзіць урокі ў музеі.

Музей школы № 16, размешчанай у мікрараёне Апанскага ў горадзе Мінску, нельга перанесці ў іншы горад, у іншы раён ці на іншую вуліцу ў гэтым жа горадзе. Бо галоўны яго змест—гісторыя Фрунзенскага раёна горада Мінска (школа—у Фрунзенскім раёне), мінулае і будучае яго вуліц, гісторыя (і, аказваецца, вельмі цікавая!) гэтай нічым не адметнай ад іншых у Мінску школы.

Існуе музей нядаўна — якіх-небудзь паўтара — два гады. Столькі, колькі займае школа сваё новае, вельмі зручнае і прасторнае памяшканне. Але наведайцеся як-небудзь сюды, і вы пераканаецеся, як многа, аказваецца, можна зрабіць за гэтыя паўтара — два гады. Вам пакажуць пісьмы, якія прыйшлі ў школу ад сяброў Фрунзе і Апанскага; фатаграфіі ветэранаў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, якія працуюць у Фрунзенскім раёне; Герояў Савецкага Саюза, якія маюць па нараджэнню, жыхарству або рабоце адносіны да Фрунзенскага раёна; кнігі пісьменнікаў, якія жывуць на тэрыторыі раёна; макеты былога Мінскага замчышча (гэта ж сёння Фрунзенскі раён) і чарцяжы перспектыўнай забудовы плошчаў і вуліц раёна. Альбомы, стэнды, макеты, муляжы музея не проста ілюструюць вядомыя вам факты, а ўзбагачаюць, дапаўняюць вашы (а значыць і школьнікаў) веды. Яны паказваюць, што гераічнае, непаўторнае, вартае найвялікшай увагі — не дзе-небудзь за трыдзевяць зямель, а побач — трэба толькі ўмець гэта ўбачыць, трэба толькі быць дапытлівым і настойлівым.

Прыйшло пісьмо ад сына Апанскага.



Таня Давыдава, Саша Куцы і Наташа Чабатарова адказваюць за альбомы і стэнды.

З харошай дапытлівасцю, з настойлівасцю актывістаў музея давялося пазнаёміцца не аднаму літаратару, вучонаму, работніку мастацтва. Памятаю, гады паўтара назад і да мяне, як да аўтара невялічкай аповесці пра Іосіфа Апанскага, звярнулася школа. Адказная за музей маладая настаўніца Вольга Мікалаеўна Дзячэнка папрасіла, каб я дапамог якімі-небудзь матэрыяламі пра Апанскага. Нічога, апрача парады, дзе весці пошукі, і адраса жонкі і сына Апанскага, я даць не мог і неўзабаве забыўся пра гэты візіт. Бо, шчыра кажучы, не раз ужо даваў і такую параду, і гэты адрас, але пераконваўся, што тыя, каму я іх даваў, вельмі хутка забываліся пра сваю добрую задуму.

На гэты раз здарылася інакш. Мінуў год, і не так даўно я атрымаў запрашэнне на сустрэчу вучняў 16-й школы з сынам Апанскага — Валянцінам Іосіфавічам. І даведаўся там, што за год, які прайшоў з часу сустрэчы маёй з настаўніцай Вольгай Мікалаеўнай Дзячэнка, калектыў школы не проста паспеў наладзіць трывалую сувязь, а па-добраму пасябраваў з жонкай і сынам Апанскага, паспеў адшукаць літоўскіх сваякоў слаўнага чэкіста, пра якіх яго жонка і сын раней нічога не ведалі, паспеў стварыць цэлы «аддзел Апанскага» са сваім загадчыкам — вучаніцай 9-га класа Зояй Харытончык.

Так, у музеі ёсць, як бачыце, «штатны расклад». Загадчыкі і супрацоўнікі аддзелаў. Супрацоўнікі, адказныя за макеты, за стэнды, за альбомы, за перапіску. Зразумела, усё гэта вучні. Нават дырэктар музея — вучаніца 9-га класа Таня Давыдава.

Пецю Бараноўскага, Сашу Аўчыннікава і Мішу Галіноўскага ведаюць у школе як «макетчыкаў» музея.

Урэшце, хто захоча зацікавіцца арганізацыяй работы ў музеі, размеркаваннем абавязкаў і г. д., няхай звяртаецца непасрэдна ў школу. Народ тут гасцінны і добразычлівы. Ахвотна раскажуць, дапамогуць, падзеляцца. І дырэктар школы Якаў Ісакавіч Якубоўскі, у бюджэце часу якога музей займае не апошняе месца, і настаўнікі, і вучні. А нам застаецца сказаць адно — добры прыклад паказвае 16-я школа. І варта яна за гэта самага шчырага слова ўдзячнасці і падтрымкі.

Ул. МЕХАЎ.
Фота **Ул. КРУКА.**

НАРАДА РАБОТНІКАЎ ВЫДАВЕЦТВАЎ, ПАЛІГРАФІІ І КНІЖНАГА ГАНДЛЮ

У Мінску 26 студзеня адбылася нарада работнікаў выдавецтваў, паліграфічнай прамысловасці і кніжнага гандлю рэспублікі. З дакладам аб чарговых задачах работнікаў выдавецтваў, паліграфіі і кнігагандлю выступіў старшыня Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР Р. В. Канавалаў.

У спрэчках па дакладу выступілі начальнік абласнога ўпраўлення па друку Віцебскага аблвыканкома М. І. Ястрабаў, намеснік старшыні Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР М. Г. Міускі, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларусь» І. Д. Казека і іншыя.

Перад удзельнікамі нарады з прамовай выступіў старшыня Камітэта па друку пры Савеце Міністраў СССР Н. А. Міхайлаў.

Нарада намеціла мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна, далейшаму паляпшэнню выдавецкай дзейнасці ў рэспубліцы.

У рабоце нарады прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў.

БЕЛТА.

СЕМІНАР РАЁННЫХ АРХІТЭКТАРАЎ

Паўтары гады назад у штатах раённых Саветаў дэпутатаў працоўных з'явілася новая пасада —раённы архітэктар. Паўнамоцны прадстаўнік архітэктурных і будаўнічых органаў, ён ажыццяўляе кантроль за выкананнем генеральных планаў і схем забудовы, назірае за якасцю будаўнічых работ, кантралюе адвядзенне участкаў, памагае абсталёўваць інтэр'еры грамадскіх будынкаў... Правоў і абавязкаў у раённых архітэктараў шмат, а вопыту— амаль ніякага. Толькі 10—15 працэнтаў таварышаў, якія займаюць гэтыя пасады, маюць спецыяльную вышэйшую адукацыю.

Практыцы і надзённым праблемам работы раённых архітэктараў прысвечаны семінар, які склікаў Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва. Сто раённых архітэктараў займаюцца вось ужо чацвёрты дзень. Перад малодшымі калегамі выступілі намеснік старшыні Дзяржбуда БССР М. Дзівакоў, начальнік аддзела планіроўкі інстытута «Белгіпрасельбуд» І. Каробкін, маскоўскія госці— начальнік аддзела сельскіх будынкаў, планіроўкі і добраўпарадкавання Галоўсельбудпраекта Дзяржбуда СССР І. Ягораў і галоўны канструктар інстытута «Дзяржпраектсельгас» Я. Ільяшэўскі, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення па будаўніцтву і архітэктуры В. Чарнышоў.

У рабоце семінара прымаюць удзел сакратар ЦК КПБ Д. Філімонаў, намеснік старшыні Савета Міністраў БССР Ул. Каменскі, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва Ул. Кароль.

Сельскія архітэктары прымуць удзел у практычных занятках, зробяць экскурсіі, абмяркоўваюць праектныя заданні. Работа семінара працягнецца да 1-га лютага.

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

ЧЫМ ДАПАМАГЧЫ ЭСТРАДЗЕ?

І НА ЭСТРАДЗЕ АДЗІН—НЕ ВОІН

Рэпертуар, рэжысура, выканаўцы— вось тры кіты, на якіх павінна трымацца эстраднае мастацтва. Не ведаю, ці здолелі б легендарныя кіты ўтрымаць зямлю ўдвух, але што аднаму яна не па сіле, гэта ясна. А на эстрадзе такая сітуацыя нярэдкая.

Рэжысура адсутнічае на эстрадзе ў васьмі выпадках з дзесяці. Што датычыць выканання, то яно настолькі ардынарнае, што спадзяванца на творчую індывідуальнасць артыста няма падстаў. І тады застаецца адзіны кіт—рэпертуар. Да яго не прад'яўляюць ужо ніякіх патрабаванняў. На сцэну вылазяць «шлягеры», якія даўно набілі аскоміну, і вось ужо рушаць у дарогу брыгады, якія апроч эстраднага «шырспажыву» нічога за душой не маюць.

Я хачу спецыяльна спыніцца на праблеме эстраднай рэжысуры. Рэжысёраў для эстрады ў нас па сутнасці ніхто не рыхтуе. Рады ў гады рэжысёрскія курсы, што існуюць пры Інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве, робяць невялікія выпускі, якія хутка растваравоцца ў бязмежных патрэбах творчых арганізацый.

Эстрадная рэжысура—гэта поўнае саматужніцтва. Рэжысёр тэатра мае ў сваім распараджэнні велізарную тэарэтычную літаратуру, іканаграфію, яму даецца канкрэтная п'еса, у якой аўтарам прадугледжана, здаецца, усё: і хто на сцэне, і што ён гаворыць. На той выпадак, калі ў рэжысёра бракуе фантазіі, дык у рэмарках указана, што персанажы робяць, а іншы раз нават што яны думаюць і адчуваюць.

А вось перад эстрадным рэжысёрам паўтара дзесятка чалавек, нумары якіх не аб'яднаны ніякім сцэнарыем. Размоўнікі і спевакі, акрабаты і жанглёры, ілюзіяністы і танцоры... У дывертысментным канцэрце — самай пашыранай форме—дастаткова расставіць іх у найбольш выгадным парадку і хоць павярхоўна звязаць канферансам. У тэатралізаваным канцэрце з загалоўкам існаванне кожнага нумара трэба ўжо апраўдаць. А ў аглядзе ўсе жанры падпарадкаваны адзінай сюжэтнай задуме. Паспрабуй тут абгрунтаваць, чаму адзін чалавек павінен стаяць дагары нагамі на галаве другога.

А абгрунтаваць трэба. Бо дывертысментная форма, калі артысты проста па чарзе выходзяць да гледачоў, дасягае мэты толькі пры моцна збітым, «нумар у нумар», калектыве. Але канцэрт і тут можа прайграць, бо нумары не ўваходзяць у жаданае ўзаемадзеянне і прыносяць гледачам толькі тое, што заключана ў кожным з іх паасобку. Майстэрства артыста ў такіх канцэртах расце ўнутры яго жанру. Дывертысмент не ставіць перад ім ніякіх іншых задач. А ў тэатралізаваным аглядзе размоўніку або спеваку часта даводзіцца прымаць удзел у агульным танцы, жанглёру—размаўляць у інтэрмедыях, акрабату — спяваць у пралогу ці фінале. Вось тут і надыходзіць самае цяжкае. Рэжысёр не толькі павінен усё гэта прыдумаць, але ў большасці выпадкаў пераадолець і коснасць артыстаў, якія не хочуць вылазіць з саматужнай шкарлупіны свайго нумара. І тут з катастрафічнай сілай выяўляецца адсутнасць сцэнічнай адукацыі, пра што ўжо гаварыў І. Палівода. Мала, што музыкант, самадзейны па сваім выканаўчым узроўні, не атрымаў спецыяльнай—а іншы раз і дастатковай агульнай—адукацыі. Ён настолькі не сфарміраваны эстэтычна, што апроч мінімальнага выкарыстання па спецыяльнасці больш нічым карысны быць не можа. Скаваны на сцэне, нясмелы і нячутны ў рэпліках, ён не здольны выканаць самае простае рэжысёрскае заданне. А ў вядучых жа калектывах, якія прыязджаюць да нас на гастролі, мы часта нават не можам разабраць спачатку, хто размоўнік, хто не—так прафесіянальна паводзяць сябе артысты ў масавых сцэнах, у тэкставых шматлюдных інтэрмедыях. І гэта заканамерная з'ява, калі мы маем справу з таленавітымі, высокаадукаванымі людзьмі. Прыгадаем хоць бы тэлевізійны КВЗ. Дзесяткі студэнтаў спяваюць, цікава і дасціпна размаўляюць, вырашаюць перад шматмільённай аўдыторыяй сцэнічныя экспромты. Як далёка іншы раз да гэтага свабоднага гучання нашым скамянелым прафесіянальным выступленням.

Кожнаму ясна, што наспела пытанне падрыхтоўкі рэжысёрскіх і акцёрскіх кадраў для эстрады. І калі адукацыяй рэжысёраў даволі заняцца, скажам, Маскве або Ленінграду, дык акцёраў трэба рыхтаваць у кожнай рэспубліцы. Гэта адзіны спосаб мець артыстаў, здольных прапагандаваць нацыянальны рэпертуар.

Лепшы рэдактар усялякай дзейнасці, лепшы доказ яе плённасці—само жыццё. Не варта, бадай, спрачацца аб уключэнні ў эстрадныя праграмы камернай музыкі або мастацкага чытання ў яго цяперашнім выглядзе. Практыка паказала, што ў эстрадны калектыў гэтыя выканаўцы не ўрастаюць. У той час, калі эстрада проста аб'ядноўвала выступленні артыстаў сумежных мастацтваў, нічога іншага гледачы ад іх не чакалі. Ды і цяпер ніхто ў глядзельнай зале, зразумела, не абурыцца выхадам скрыпача з Чайкоўскім і Сен-Сансам або чытальніка з вершамі Раждзественскага і Ашаніна. Але ж ці таго чакаюць гледачы, ідучы на эстрадны канцэрт? Хочам мы ці не, але «спецыялізацыя» ў мастацтве ўсталявалася якраз таксама, як і ва ўсіх іншых галінах чалавечай дзейнасці. Не збіваючы паняцце «эстраднасць», нельга заплюшчваць вочы на тое, што гэта паняцце існуе ў зусім пэўных межах, і нічога тут благога няма.

Вось цяпер мы дабраліся да трэцяга кіта—гаворка пойдзе пра рэпертуар.

Мне здаецца, што тэзіс І. Паліводы аб папаўненні рэпертуару эстрады вялікай літаратурай, часопісным гумарам і г. д у нейкай меры афіцыйны. Хто з аўтараў эстрады адмовіцца ад свайго, нацыянальнага, арыгінальнага рэпертуару? Гэта надае выканаўцу непаўторнасць, гарантуе, што ён не трапіць на пляцоўку, дзе яго рэпертуар ужо выконваўся. Нацыянальны рэпертуар, у меру ведання літаратуры, артысты выкарыстоўваюць. Якуб Колас, байкі Кандрата Крапівы, лірычны гумар Пімена Панчанкі, героіка Петруся Броўкі — усё гэта гучала ў праграмах беларускай эстрады. «Замовы» Ніла Гілевіча і цяпер з нязменным поспехам выконваюцца на канцэртах Але ж гэта шчаслівая выпадковасць, калі пісьменнік звяртаецца да формы, якая найбольш падыходзіць эстрадзе. А калі не? Эстрада мае штодзённую, штогадзінную патрэбу ў новым матэрыяле, а для эстрады ў нас пішуць мала і вельмі рэдка.

Сёй-той спрабуе сцвярджаць, быццам артысты эстрады цураюцца нацыянальнага рэпертуару. Чаму ж гэта? Навошта? Калі матэрыял варты, яго хапаюць, як галодны хапае кавалак хлеба. Але калі выканаўцу спрабуюць навязаць матэрыял, які нічога не абяцае, і адмаўленне ад яго лічаць знявагаю—гэта ўжо нядобрасумленна.

У магазінах падарункаў камплектуюць падарунчныя пакеты па такім прынцыпе: хочаш купіць пальчаткі, купі яшчэ і бюст Ньютана. Дык вось трэба, каб беларускія матэрыялы ў нашых эстрадных праграмах былі асноваю іх поспеху, а не фармальным дадаткам. Іменна на такім прынцыпе павінны стварацца нашы тэкставыя і музычныя творы. Бо ўсё тое ж усемагутнае жыццё даказвае— калі твор добры, яго бяруць неадкладна. І ён выконваецца не толькі ў нас, а і ў іншых рэспубліках.

І яшчэ адной акалічнасці неабходна паглядзець шчыра ў вочы: вялікая літаратура ніколі не жывіла эстраду. Літаратура Расіі зусім не слабейшая за нашу, і ўсё ж у эстрадных праграмах мы сярод аўтараў бачым Бахнова і Касцюкоўскага, Канстанцінава і Рацара, Аляксандрава і Севасцьянава, Марка Якаўлева і г. д., а не вядучых раманістаў і паэтаў. Значыць, неабходна пэўнае кола аўтараў—спецыялістаў па эстрадзе, з адпаведным бачаннем рэчаіснасці, з добрым валоданнем эстраднымі формамі, спецыялістаў, якія лічылі б сваю працу для эстрады не адыходніцтвам ці «хвілінамі адпачынку» паміж «вялікімі здзяйсненнямі», а сэнсам жыцця. Перспектыва ў іх была б добрая, а ў творчасці беларускіх эстрадных артыстаў гэта стала б рашаючай вяхой.

У эстрады нямала тэхнічных цяжкасцей. Тэхнічная незабяспечанасць прыводзіць да спрашчэння рэжысёрскіх вырашэнняў. Уключэнне ў брыгаду рабочага сцэны ці электрыка павялічвае, напрыклад, выдаткі і таму непажадана. А партатыўнай апаратуры для асвятлення і светлавых эфектаў, якую б магли абслугоўваць самі ўдзельнікі брыгад, у нас няма. Гэта нярэдка прыводзіць да таго, што першапачатковы малюнак праграмы, які з найвялікшым напружаннем быў падрыхтаваны для здачы, збядняецца.

Эстраднае мастацтва, бадай, цяпер самае дыферэнцыраванае: калі нават маленькія тэатры жывуць агульнымі інтарэсамі са сваімі вялікімі братамі, стараюцца не адставаць ад іх ні ў рэпертуары, ні, па магчымасці, у пастановачных вырашэннях, дык сярод эстрадных калектываў, як гэта ні прыкра, на адным полюсе—сучаснае інтэлектуальнае шматкаляровае мастацтва, а на другім—няхітрае саматужніцтва, што любымі сродкамі імкнецца дамагчыся поспеху ў гледача.

Зрабіць эстраду—усю эстраду — паўнацэннай і вартай павагі — вось якая наша задача. Работы—непачаты край. Але пачынаць яе ўсё роўна трэба. І чым хутчэй, тым лепш. Вось чаму мне вельмі важнай уяўляецца гаворка, якая ўзнікла вакол артыкула І. Паліводы.

І. ЛАКШТАНАЎ.

ВУЧЫЦЬ, ПЕРАКОНВАЦЬ, ВЫХОЎВАЦЬ

З VIII ПЛЕНУМА БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА САВЕТА ПРАФСАЮЗАЎ

У цэнтры ўвагі чарговага пленума Белсаўпрофа, які днямі адбыўся ў Мінску, стаялі пытанні паляпшэння выхаваўчай работы сярод працоўных і ўмацавання сацыялістычнай дысцыпліны працы. З дакладам выступіла сакратар Беларускага савета прафсаюзаў М. Дубкова.

— На высокай хвалі сацыялістычнага спаборніцтва, — гаворыць яна, — паспяхова фінішавала сямігодка, і адразу пачаўся старт народнай гаспадаркі ў новую пяцігодку. Рашэнні сакавіцкага і верасневага Пленумаў ЦК КПСС раскрываюць шырокую прастору для сапраўды навуковага выкарыстання эканамічных законаў сацыялізма, выклікаюць да жыцця невычэрпныя крыніцы народнай гаспадарчай ініцыятывы і вопыту. Характэрная рыса спаборніцтва ў гонар XXIII з'езда КПСС — смелы масавы пошук найбольш эфектыўных метадаў павелічэння вытворчасці, гаспадарчага падыходу да ацэнкі эканамічных вынікаў дзейнасці прадпрыемстваў і шляхоў да новага ўздыму.

У арсенале сродкаў выхаваўчай работы нашых прафсаюзаў ёсць многа форм прыцягнення працоўных да кіравання прамысловасцю. Гэта — агульныя сходы калектываў, пастаяннадзеючыя вытворчыя нарады, аб'яднанні працоўных па інтарэсах і г. д. Шырока ўкараніліся ў рэспубліцы грамадскія творчыя аб'яднанні — канструктарскія і тэхналагічныя бюро, бюро эканамічнага аналізу, тэхнічнай інфармацыі, нарміравання працы, бюро і саветы вытворчай эстэтыкі і г. д.

І дакладчык, і астатнія ўдзельнікі пленума падкрэслівалі, што нельга па-сапраўднаму змагацца за развіццё эканомікі і культуры, не павышаючы ўзровень свядомасці ўсіх членаў грамадства, не развіваючы ў кожным савецкім чалавеку імкнення працаваць творча.

Па-святочнаму ўрачыста ўшаноўваюцца ветэраны працы на многіх прадпрыемствах рэспублікі, іх вітаюць з юбілеем, з днём нараджэння. Гэтыя святы працы пакідаюць незабыўны след у сэрцах маладых рабочых.

— Надзвычай важна, як заахвочваюцца лепшыя людзі нашых прадпрыемстваў, — гаворыць намеснік дырэктара Беларускага аўтазавода ў Жодзіне В. Новікаў. — Жыццё патрабуе шукаць новыя формы ўздзеяння на свядомасць людзей. Некалькі год назад на гэтым прадпрыемстве граматамі ўзнагароджвалі вялікую колькасць рабочых і служачых. Але вынікі часам атрымліваліся не тыя, якія хацелася б мець. Былі выпадкі, калі граматы атрымлівалі людзі, якія парушалі дысцыпліну працы. А гэта, вядома, зніжала, абясцэньвала ўзнагароды.

Дырэкцыя завода абмеркавала гэтае пытанне разам з партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі. Прынята новае палажэнне, якое прадугледжвае больш строгі падыход да заахвочвання лепшых людзей завода.

Намнога павышаецца цяпер роля прафсаюзных клубаў, бібліятэк, чырвоных куткоў. Іх абавязак — усімі сваімі сродкамі памагаць партыйным арганізацыям у прапагандзе рашэнняў Пленумаў ЦК КПСС. Не «культурніцтва» і розныя танныя забавы, а глыбокая і мэтанакіраваная работа кожнай установы культуры па выхаванню савецкага чалавека. Нездарма ў нас, — гаварыла загадчыца прафсаюзнай бібліятэкі віцебскай фабрыкі «КІМ» В. Шуфель,— культурна-асветную работу называюць чалавеказнаўствам. Бо чым бы ні займаўся работнік культуры, якія б вечары і канферэнцыі чытачоў ні прыдумваў — заўсёды сферай яго дзейнасці будзе чалавек. Выхаванне не слесара, не шафёра, не ткачыхі, не даяркі, а менавіта чалавека—з высокім адчуваннем грамадзянскага абавязку і маралі, свядомага будаўніка камунізма.

Прафсаюзная бібліятэка фабрыкі імкнецца, каб кожны малады рабочы быў чытачом бібліятэкі, каб ён чытаў па індывідуальных планах, якія тут названы «мінімумам культурнага чалавека». У планы ўключаны некаторыя працы Ул. І. Леніна, лепшыя патрыятычныя творы савецкіх пісьменнікаў, літаратура ў дапамогу вытворчасці, а для тых, хто цікавіцца музыкай, мастацтвам, складаюцца спецыяльныя спісы літаратуры. Цікава прайшла тут канферэнцыя па рабоце Ул. І. Леніна «Вялікі пачын». Цяпер бібліятэка разам з камітэтам камсамола фабрыкі рыхтуе канферэнцыю чытачоў на тэму «Вучыцца камунізму» (за аснову бярэцца прамова Ул. І. Леніна на III з'ездзе камсамола).

— Жыццё вымагае ад нас павысіць узровень ідэйна-выхаваўчай работы ва ўсіх звеннях прафсаюзнай дзейнасці, — сказаў старшыня Віцебскага абласнога савета прафсаюзаў М. Растаргуеў. — Кіно — магутны сродак выхавання чалавека. На жаль, на Віцебшчыне органы кінафікацыі і пракату часам падыходзяць да гэтай справы, кіруючыся чыста камерцыйнымі меркаваннямі. Існуе падзел на «касавыя» і «някасавыя» фільмы. У выніку на экранах кінатэатраў абласнога цэнтра нярэдка аддаецца перавага замежным фільмам не першага гатунку. А для лепшых карцін айчыннай вытворчасці пакідаецца і мала дзён і мала сеансаў. Мне здаецца, — зазначае М. Растаргуеў, — што гэта вынік няўвагі да рэкламы фільма, вынік слабай сувязі органаў кінафікацыі з партыйнымі, прафсаюзнымі арганізацыямі фабрык, заводаў, навучальных устаноў, будоўляў.

Добрую ініцыятыву праявіў Гродзенскі абласны савет прафсаюзаў. На прэзідыуме савета вырашана ўстанавіць дні тэатра для кожнага прадпрыемства. Мэта іх — гаворыць старшыня аблсаўпрофа П. Болазеў, — наблізіць наш тэатр да гледача.

Старшыня заўкома Магілёўскага завода штучнага валакна Л. Марынічава падкрэсліла, што Дом культуры іх прадпрыемства працуе ў цеснай сувязі з патрэбамі вытворчасці. Многа аддаецца ўвагі выхаванню маладых рабочых на лепшых працоўных традыцыях калектыву. Вечары наватара, сустрэчы з ветэранамі завода, злёты ўдарнікаў камуністычнай працы, пастаянны кіналекторый, разнастайныя тэматычныя вечары заўсёды збіраюць вялікую аўдыторыю.

Увядзенне новай сістэмы гаспадарання патрабуе ад культасветработнікаў прафсаюзаў крытычнай ацэнкі сваёй дзейнасці, павышэння выхаваўчай ролі нашых клубаў, бібліятэк, народных універсітэтаў, мастацкай самадзейнасці. Істотным недахопам работы многіх прафсаюзных устаноў культуры з'яўляецца павярхоўнасць, элементы фармалізму ў працоўным выхаванні чалавека. На пленуме адзначалася, што яшчэ суха, бледна і невыразна расказваюць некаторыя прафсаюзныя клубы і бібліятэкі пра перадавікоў спаборніцтва. На дошках гонару, напрыклад, часта можна ўбачыць партрэт перадавіка і кароценькі надпіс: план выкананы на столькі-та працэнтаў. Але, вядома, гэтым нельга абмяжоўвацца ў распаўсюджванні вопыту важакоў спаборніцтва.

У практыцы культурна-асветнай работы яшчэ мала аддаецца ўвагі маральным праблемам сацыялістычнага спаборніцтва, руху за камуністычную працу. У работнікаў культуры ёсць многа форм і метадаў работы, якія павінны раскрываць маральнае аблічча будаўніка камунізма.

Многія прамоўцы гаварылі пра кадры работнікаў прафсаюзных устаноў культуры. Мала ў нас яшчэ спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй, ужо не гаворачы пра вышэйшую. Час прыняць нейкія дзейсныя захады, каб вырашыць, нарэшце, гэтую праблему. Семінары, кароткатэрміновыя курсы, якія праводзяцца ў абласцях і Мінску, — гэта толькі часовая мера.

З прамовай на пленуме выступіў старшыня Рэспубліканскага савета прафсаюзаў І. Макараў.

У прынятай пастанове намечаны канкрэтныя меры па ўзмацненню выхаваўчай работы сярод працоўных.

КОНКУРС УСЕСАЮЗНАГА РАДЫЁ

Камітэт па радыёвяшчанню і тэлебачанні пры Савеце Міністраў СССР аб'явіў конкурс на лепшую радыёперадачу аб савецкім чалавеку. Гэта могуць быць радыёнарысы, кароткія расказы, рэпартажы, літаратурныя партрэты, якія паказваюць вобраз савецкага чалавека, яго высокую ідэйную перакананасць, усведамленне свайго абавязку перад партыяй і народам, яго гераізм, шырыню інтарэсаў, высакародства і іншыя якасці, уласцівыя сапраўдным будаўнікам камуністычнага заўтра.

На конкурс, які працягнецца з 1-га лютага па 31 сакавіка 1966 года, прадстаўляюцца матэрыялы ў тэксце і ў запісе на плёнку гучаннем да 20 мінут.

Усесаюзнае радыё запрашае прыняць удзел у конкурсе работнікаў радыё і тэлебачання, супрацоўнікаў газет і часопісаў, пісьменнікаў, усіх жадаючых.

За лепшыя матэрыялы, прысланыя на конкурс, устаноўлены прэміі: адна першая ў суме — 200 рублёў, дзве другія па — 150 рублёў, дзве трэція па — 100 рублёў, тры заахвочвальныя па — 50 рублёў.

Матэрыялы на конкурс трэба накіроўваць на адрас: Масква, Пятніцкая, 25, Усесаюзнае радыё. На канвертах трэба зрабіць паметку «На конкурс».

Дадатковыя даведкі па ўмовах конкурсу і кансультацыі можна атрымаць на карэспандэнцкім пункце Усесаюзнага радыё ў БССР. Яго адрас: Мінск, Красная, 4, Дом радыё, тэл. 3-81-34 і 3-81-80.

КУЛЬТУРА ВЫДАННЯ

Барыс ЗАБОРАЎ

З цікавасцю прачытаў я змешчаны ў «Літаратуры і мастацтве» 14 студзеня г. г. артыкул Вольгі Церашчатавай «Выяўленая сіла шрыфту». Па-дзелавому вядзе аўтар гаворку пра тое, што сёння вельмі непакоіць усіх, хто звязаны з афармленнем кнігі. Мне б хацелася больш дэталёва закрануць некаторыя агульныя пытанні шрыфтавога афармлення выданняў, якія выпускаюць нашы выдавецтвы, і перш за ўсё — «Беларусь».

Кніга — гэта твор мастацтва. Яна сінтэзуе ў сабе намаганні аўтара, мастака, мастацка-тэхнічнага рэдактара, друкара. Тут мае значэнне кожны элемент — ад вокладкі да афармлення выхадных дадзеных.

Умела выкарыстоўваючы наборны шрыфт, яго абрысы, памер, колер, розныя прыёмы набору, можна дасягнуць сапраўднай прыгажосці выдання. Шрыфт павінен выступаць не толькі як неабходны элемент кнігі, але і ўздзейнічаць на чытача эстэтычна. Ад таго, які абрыс шрыфту выбраў мастак, як яго скампанаваў у паласе набору, залежыць агульны колер і характар старонкі, а ўсё разам стварае пэўны эмацыянальны вобраз. Трэба імкнуцца да таго, каб, глянуўшы на старонку, можна было вызначыць стыль і жанр твора гэтак жа, як, глянуўшы на палатно мастака, можна па колернай гаме шмат у чым вызначыць настрой карціны. Інакш кажучы, сціплым арсеналам паліграфічных сродкаў можна дабіцца таго, што наборнае афармленне надасць выданню значнае мастацкага твора.

У гэтым кірунку ў нас вядзецца работа, якая прыносіць пэўныя поспехі. Прыкладамі ўдалага шрыфтавога афармлення кнігі можна лічыць работу мастачкі В. Жыжэнка (зборнік вершаў А. Пысіна «Мае мерыдыяны»), мастака Л. Прагіна («Бальшавіцкая газета «Правда» ў Беларусі», «Чалавек працаю слаўны»). Апошняя названая кніга можа служыць добрым узорам творчых адносін мастака да ўсіх стадый работы над кнігай. Л. Прагін у гэтым выданні зрабіў і тэхнічнае афармленне, якое спрыяе цэльнасці і выразнасці тэкставага афармлення. У добра арганізаваных спусках мастак умела выкарыстаў наборныя элементы, з якіх складзены арнамент, звязаны са зместам кнігі. Супервокладка афармлена ўдала знойдзеным рукапісным шрыфтам. Дэкаратыўны паясок на ёй складзены з наборных элементаў, што звязвае супервокладку з усім унутраным афармленнем выдання.

Каб дасягнуць такіх вынікаў, як у прыведзеных прыкладах, мастак павінен вызначацца прафесійнай культурай, мець добры густ. Але апроч усяго іншага, у яго распараджэнні павінен быць значны выбар тыпаў і кегеляў шрыфту.

В. Церашчатава бачыць прычыну «манатоннасці і аднастайнасці» шрыфтавога афармлення многіх нашых выданняў у тым, што мастакі і выдавецтва прытрымліваюцца «ўсталяваных традыцый» у выбары шрыфту і варыяцый яго. У сапраўднасці ж прычыны —у іншым. Перш за ўсё, у вельмі абмежаваным асартыменце тыпаў шрыфтоў, у адсутнасці многіх кегеляў ужо наяўных шрыфтавых гарнітур.

Мастакі кнігі Д. Лазурскі, С. Тэлінгатэр распрацавалі новыя малюнкі наборнага шрыфту. Яшчэ ў 1959 г. на Міжнароднай выстаўцы кнігі ў Лейпцыгу іх шрыфты былі адзначаны залатым і сярэбраным медалямі. Але прайшло ўжо сем гадоў, а гэтыя шрыфты так і не з'явіліся ў касах нашага паліграфічнага камбіната. Крыўдна, што з-за безгаспадарчасці адпаведных арганізацый цярпіць у цэлым культура афармлення нашай кнігі. Нашы мастакі маюць у сваім распараджэнні невялікую колькасць гарнітур устарэлага малюнка і, вядома, не могуць вырашыць задачы сучаснага афармлення кнігі.

Другой прычынай многіх няўдач шрыфтавога афармлення выданняў можна лічыць дрэнную падрыхтоўку мастакоў-графікаў, якія працуюць у гэтай галіне.

Многія нашы мастакі, не толькі маладыя, але і тыя, што шмат гадоў працуюць у галіне афармлення кнігі прынёсшы ў рэдакцыю вокладку і чан[illegible]а, што шрыфтавое афармлен[illegible] — справа мастацкага рэдак[illegible]ра і не мае дачынення да ма[illegible]стацтва. Шчыра кажучы, я і сам так лічыў, пакуль усур'ёз не заняўся кніжным афармленнем. Цяпер я разумею, як шкодзіць падобнае перакананне. Работа над ілюстрацыямі і шрыфтавое афармленне кнігі—неадзельныя адно ад аднаго. Умелае размяшчэнне набору можа выдзеліць малюнак і ўзмацніць яго выразнасць, ад спалучэння гэтых элементаў залежыць аблічча кнігі.

У нашым выдавецтве працуюць высокакваліфікаваныя мастакі рэдактары. Але яны фізічна не могуць паспець дасканала прадумаць шрыфтавое афармленне ўсіх кніг. Гэтым павінны займацца самі мастакі.

Нават пры наяўнасці цудоўных ілюстрацый кніга не будзе кнігай без пластычнага і сэнсавага спалучэння гэтых ілюстрацый са шрыфтам, шрыфту з фарматам, паласой набору, фарбай і паперай, г. зн. з усімі сродкамі паліграфічнай выразнасці.

Толькі сувязь усіх элементаў афармлення кнігі са зместам і стылем мастацкага твора плюс высокае паліграфічнае выкананне надаюць кнізе эстэтычныя ўласцівасці, робяць яе мастацкім творам.

Наколькі мне вядома, студэнты графічнага факультэта Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута атрымліваюць вельмі прыблізнае ўяўленне аб наборных шрыфтах і магчымасцях іх прымянення пры афармленні кніг. Дарэчы, гэта бяда не толькі мінскага інстытута. Па-мойму, ні адзін мастацкі інстытут краіны, за выключэннем мастацкага аддзялення Маскоўскага паліграфічнага інстытута, не рыхтуе высокакваліфікаваных мастакоў — афарміцеляў кнігі.

Каб лішні раз пераканацца, што ў нас яшчэ нестае кваліфікаваных мастакоў — афарміцеляў кнігі, дастаткова глянуць на прадукцыю нашых беларускіх выдавецтваў. Яны выпускаюць палітычную і навукова-тэхнічную літаратуру, афармленне якой грунтуецца, як правіла, толькі на выкарыстанні наборнага шрыфту. Сумны выгляд маюць такія кнігі.

Узорам безгустоўшчыны можа служыць «Зборнік самастойных і кантрольных работ па фізіцы» (выдавецтва «Народная асвета»). На вокладцы гэтай кнігі мастак кожнае слова напісаў розным шрыфтам, прычым шрыфтам, калі можна так сказаць, антымастацкім. Уся гэтая шрыфтавая «сімфонія» разыгрываецца на аранжава-сінім фоне... Якое ж эстэтычнае ўздзеянне можа зрабіць такое выданне на чытача? А гэта ж вучэбны дапаможнік!.. Між іншым, кніга гэтая стаяла на выставачным стэндзе лепшых кніг выдавецтва.

Многа такой прадукцыі выпускаюць выдавецтвы «Ураджай», «Вышэйшая школа», «Навука і тэхніка»!..

Далей мне хацелася б сказаць аб бессэнсоўным прымяненні рукапісных шрыфтоў, якія пішуцца «пад набор», але, вядома ж, выглядаюць значна горш, чым набор. Возьмем кнігу «Вірусныя хваробы бульбы і метады вырошчвання здаровых клубняў». Каб напісаць такі доўгі загаловак, мастак затраціў шмат працы, але ж гэта Сізіфава праца! А можна ж было добра аформіць такі пераплёт пры дапамозе наборнага шрыфту!

Падобных прыкладаў таксама вельмі многа.

Трэба сказаць, што не толькі адсутнасць мастакоў—майстроў шрыфтавога афармлення кнігі, але і адсутнасць добрай паліграфічнай базы не дае магчымасці памянёным выдавецтвам выйсці з тупіка.

Яшчэ на адной праблеме мне хацелася б спыніцца. Ул. Фаворскі пісаў: «Цэльнасць (кнігі.—Б. З.) можа быць дасягнута тым, што як літары, так і ілюстрацыі будуць намі ўзяты аднатыпныя, тады натуральна само сабой ствараецца аб'яднанне кніжнага матэрыялу, усё, што ў яе ўвойдзе, атрымае адзіную прастору». Правільнасць тэзіса Ул. Фаворскага бясспрэчная. Але сёння з не меншым поспехам можна сцвярджаць, што выкарыстанне разнатыпных шрыфтоў, умелае іх спалучэнне, гарманічнае вліццё іх з ілюстрацыйным матэрыялам і стылем твора могуць зрабіць кнігу цэльнай па архітэктуры.

Эстэтычная норма — паняцце не нязменнае. Напрыклад, сучасны інтэр'ер выклікаў бы непаразуменне нават у найбольш прагрэсіўных прадстаўнікоў канца мінулага стагоддзя. А мы, у сваю чаргу, здзіўляемся, гледзячы на ўзоры кніжнага афармлення тых гадоў, хаця для свайго часу яно было прагрэсіўным. І яшчэ: сёння мы лічым магчымай прысутнасць у сучасным інтэр'еры крэсла стылю «ампір». Гэта сапраўды можа быць прыгожым. Інакш кажучы, тое, што ўчора яшчэ лічылася несумяшчальным, сёння здаецца прыгожым. Мне могуць задаць пытанне: што ж такое прыгажосць? Не думаю, што хтонебудзь возьме на сябе смеласць даць вычарпальны адказ на гэтае пытанне. Паняцце «прыгажосць» уключае ў сябе вялікую колькасць эстэтычных аспектаў і ў розныя эпохі ўспрымалася па-рознаму.

Прымяненне разнатыпных шрыфтоў у адной кнізе яшчэ зусім нядаўна лічылася немагчымым. Здавалася, што шрыфты розных па малюнку гарнітур не могуць «мірна суіснаваць». А на самой справе такое спалучэнне можа даць цудоўныя вынікі. У гэтым я пераканаўся, пабываўшы на Міжнароднай выстаўцы кнігі ў Лейпцыгу. Я бачыў узоры здзіўляючага спалучэння ампірнага рукапіснага ініцыяла і сучаснага набору. Гэта надавала кнізе не толькі большую дэкаратыўнасць, але і паказвала на пэўную пераймальнасць традыцый у кніжным афармленні. Я бачыў многа прыкладаў, умелага выкарыстання разнатыпных наборных шрыфтоў у тэкставым афармленні.

На мой погляд, нам трэба смялей эксперыментаваць у гэтым напрамку. Зусім зразумела, што згарманізаваць разнатыпныя шрыфты і пры гэтым не «трапіць» у разнастыльнасць значна цяжэй, чым пры выкарыстанні шрыфтоў аднаго тыпу. Гэта патрабуе ад мастака добрага густу і пачуцця меры.

Прымяненне разнатыпных шрыфтоў не павінна быць проста данінай модзе. Яно павінна стаць унутранай неабходнасцю для мастака, якая адпавядала б яго эстэтычным прынцыпам. І самае галоўнае, каб прымяненне розных шрыфтоў дыктавалася стылявымі асаблівасцямі мастацкага твора.

Цудоўны афарміцель кнігі Эль Лісіцкі, які лічыў шрыфт асноўным будаўнічым матэрыялам кніжнай архітэктуры і бліскуча даказаў гэта ўсёй сваёй творчасцю, пісаў: «Я лічу, што думкі, якія мы п'ём з кнігі вачыма, мы павінны ўліць праз усе формы, якія вачыма ўспрымаюцца. Літары, знакі прыпынку, якія ўносяць парадак у думкі, павінны быць улічаны, але апроч гэтага бег радкоў сыходзіцца ля якіхсьці скандэнсаваных думак, іх і для вока трэба скандэнсаваць».

Яшчэ раз хочацца засцерагчы ад бяздумнага прымянення шрыфтоў, прадыктаванага толькі модай. Вось прыклад. Рубленая гарнітура, у прыватнасці, «дубовая». сустракалася вельмі рэдка ў нашых выданнях, а за апошні час яе выкарыстанне дало вельмі добрыя вынікі. Але, на жаль, многія нашы мастакі сталі ўжываць гэты шрыфт непрадумана. У выніку не толькі церпіць кніга, але і дыскрэдытуецца добрая ідэя. «Рэха навальніцы»—зборнік вершаў А. Бялевіча (мастак Ул. Басалыга)—мог быць добрым у сэнсе афармлення, калі б не недарэчнае выкарыстанне рубленага буйнога шрыфту на супервокладцы, тытуле і шмуцтытуле. Ён зусім не звязаны з тонкімі малюнкамі і з усім унутраным шрыфтавым афармленнем. Або кніга «Міг бліскавіцы» Вячаслава Адамчыка (мастак В. Шаранговіч), дзе вялізныя «дубовыя» ініцыялы больш звяртаюць на сябе ўвагі, чым сюжэтныя застаўкі, зробленыя тонкай лініяй.

Кнігі, якія ўчора здаваліся свайго роду эталонам афармлення, сёння не могуць задавальняць нас. На Усесаюзным конкурсе лепшых кніг года цяпер ставяцца вельмі жорсткія патрабаванні. І гэта справядліва. Міжнародная выстаўка кнігі ў Лейпцыгу ў мінулым годзе паказала ясна, што для таго, каб дасягнуць лепшых сусветных узораў, нам трэба шмат працаваць. А для таго, каб работа магла ісці паспяхова, патрэбна, нарэшце, вырашыць пытанне асартыменту шрыфтоў, падрыхтоўкі высокакваліфікаваных мастакоў — афарміцеляў кнігі і палепшыць паліграфічнае выкананне работ.

САМЫ МАЛАДЫ

Бярозаўскі гісторыка-рэвалюцыйны музей самы малады ў нашай рэспубліцы. Ён адкрыўся напярэдадні Кастрычніцкіх свят мінулага года.

Шматлікія экспазіцыі музея расказваюць яго наведвальнікам аб развіцці рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі былога Пружанскага павета, аб падзеях, што тут адбываліся ў 1905 годзе і ў гады імперыялістычнай вайны.

Багаты каштоўнымі рэліквіямі раздзел «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Грамадзянская вайна».

Шмат цікавых дакументаў і экспанатаў знаходзіцца і ў раздзелах, прысвечаных дзейнасці КПЗБ у перыяд белапольскай акупацыі, незабыўным верасневускім дням 1939 года, усенароднай партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У музеі за апошні месяц пабывалі дзесяткі экскурсій школьнікаў, калгаснікаў, рабочых, служачых Бярозаўскага і суседніх раёнаў.

А. АЛІН.

Многа цікава афармленых стэндаў, выставак, вітрын, альбомаў зроблена рукамі бібліёграфа Маладзечанскай гарадской бібліятэкі Алы Гатоўскай. На гэтым здымку вы бачыце як яна афармляе стэнд «Барацьба за Уладу Саветаў у Маладзечне».

ЯК НАРАДЖАЕЦЦА ПЕСНЯ

Пад такой назвай у Брэсцкім клубе сувязістаў прайшоў вечар-канцэрт. На ім прагучалі песні мясцовых кампазітараў. Сярод іх творы А. Шутава «Брэсцкі вальс» (словы Б. Захарычава), «Балада пра бацьку» і «Песня пра юнацтва» (словы М. Шушкевіча), «Дзявочая» (словы С. Вароніна), «Бярозка» (словы А. Уладзімірава), «На Валынцы» (словы С. Іглі-на), а таксама песні заслужанага дзеяча культуры М. Солапава на словы мясцовага аўтара Д. Васільева «Над Волгай», «Не сумуй, бярозачка», «Вішанька». Вечар-канцэрт прайшоў з удзелам артыстаў гарадскога народнага хору рускай песні.

На здымку — сцэна са спектакля «Разведчыцы». У ролях: Каці Аляксеевай — Жана Шабан, маёра Іванова — Іван Пятровіч Доўгіх.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА.

ПРЭМ'ЕРА СТУДЫЙЦАЎ

У жыцці тэатральнай самадзейнасці Мінска адбылася яшчэ адна цікавая падзея. 24 студзеня тэатральная студыя Палаца культуры прафсаюзаў паказала прэм'еру спектакля «Разведчыцы» па рамантычнай драме Ігара Собалева. Рэжысёр спектакля — Ул. Багалюбскі.

Перад гледачом ажывае адна са слаўных баявых старонак жыцця нашых разведчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Спектакль расказвае пра дзяўчат, якія добраахвотна прыйшлі ў школу разведчыкаў. Ідучы на подвіг, дзяўчаты мараць аб мірным жыцці, дзецях, сям'і. Ролю Каці Аляксеевай іграе адна са старэйшых удзельніц студыі Ж. Шабан. Студыйцы Э. Мелкая (Люба), Л. Ламака (Надзя), І. Шалянкоў (Сяргей Грачоў) запамінаюцца ў сцэнах у варожым тыле ў лесе, у канцлагеры, у сцэне гібелі Каці і Сяргея.

Мастацкае афармленне спектакля вырашана мастакамі В. Кульваноўскім і Ю. Турам проста, без нагрувашчання лішніх дэталей.

Гэты спектакль — першая прэм'ера калектыву ў 1966 годзе. Сваю работу студыйцы прысвячаюць 50-годдзю Вялікага Кастрычніка.

В. БАРЫСЕВІЧ.

ПАДАРУНКІ СЯБРОЎ

Кніжны фонд бібліятэкі Саюза пісьменнікаў БССР штогод папаўняецца творамі літаратараў братніх краін. Сюды ў якасці падарункаў прыходзяць лепшыя выданні Чэхаславакіі, Румыніі, Польшчы, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Цудоўнае выданне зборніка казак «Маленькі Пётр» атрымана з Берліна. Кніга багата ілюстравана. З ГДР даслалі зборнік паэзіі і прозы, у якім змешчаны лепшыя творы Ж. Амаду, Л. Арагона, І. Бехера, П. Нэруды, М. Ціханава, І. Эрэнбурга і іншых.

Некалькі паэтычных зборнікаў і раманаў атрымана з Югаславіі і Польскай Народнай Рэспублікі.

З нашай ПОШТЫ

На магіле Змітрака Бядулі

Моцная дружба звязвае працоўных Прыуралля са студэнтамі нашай рэспублікі. Кожны год эшалоны з маладымі энтузіястамі ідуць з Мінска на ўсход. На пероне далёкага горада Уральска беларускіх студэнтаў сустракаюць даўнія сябры. Студэнты з Беларусі прыязджаюць сюды на свой трэці «працоўны семестр».

Але перш чым нашы хлопцы і дзяўчаты адправяцца ў далёкія казахстанскія аулы і пасёлкі, яны прыходзяць на ўскраіну Уральска, на магілу Змітрака Бядулі, каб аддаць даніну павагі аўтару «Салаўя» і «Малых дрывасекаў» — чалавеку, па кнігах якога вучыліся чытаць, вучыліся разумець жыццё.

Шмат сяброў-уральцаў у Змітрака Бядулі. Яго кнігі, перакладзеныя на рускую мову, карыстаюцца шырокім попытам у чытачоў горада. Клопаты аб магіле пісьменніка сталі клопатамі многіх жыхароў Уральска. Сакратары абкома камсамола В. Камкоў і Ул. Бурмакоў, сакратар гаркома камсамола Ул. Заўгароднеў, загадчыца школьнага аддзела гаркома камсамола В. Васкабойнікава, вядомы ў Казахстане скульптар, аўтар шэрага работ пра В. І. Чапаева Хасан Шамсутдзінаў, журналіст Ф. Ігнатаў, студэнты педагагічнага інстытута, камсамольцы механічнага завода — гэта яны знайшлі сродкі і матэрыялы для новай надмагільнай пліты і агарожы.

Шэфствуюць над магілай пісьменніка вучні сярэдняй школы № 5 і студэнты філалагічнага факультэта мясцовага педінстытута. Яны часта прыходзяць на магілу Змітрака Бядулі, клапатліва даглядаюць яе.

А калі прыязджаюць студэнты з Беларусі, шэфы запрашаюць іх у госці, просяць расказаць падрабязней пра Змітрака Бядулю, пра яго кнігі, пра сваіх аднагодкаў з далёкай братняй рэспублікі.

М. ЛАТЫШ,
былы камсорг Беларускага студэнцкага будаўнічага атрада.

ПА ЭКЗЕМПЛЯРУ НА РАЁН

Цягнік спыніўся на станцыі Асіповічы. Прыпынак 15 мінут.

Пасажыры выйшлі з вагонаў на перон і падаліся хто ў буфет, хто ў кіёск, каб прыхапіць што-небудзь у далёкую дарогу.

Выйшаў на перон і Павел Кузьміч Саленік, інжынер з Мінска, які ехаў у Харкаў у камандзіроўку.

Кіёск «Саюздруку» быў адкрыты і вабіў да сябе пакупнікоў разнастайнымі фарбамі вокладак часопісаў, кніг, газет. Захацеў інжынер пачытаць у дарозе раман Івана Мележа «Людзі на балоце».

— Няма, — абыякава адказала кіяскёрка.

Не аказалася ў кіёску ніводнай кнігі Я. Брыля, І. Шамякіна, А. Кулакоўскага. Але пакупнік быў настойлівы і папрасіў брашуркі серыі «Бібліятэчка атэіста».

Тады не вытрымала кіяскёрка і са злością кінула:

— Няма, не атрымліваем мы такіх выданняў, яны ў нас не ідуць.

Павел Кузьміч вярнуўся ў вагон без кнігі.

— Ну што ж, няма кніг,— заб'ём «казла», — вырашыў ён.

Чаму не было кніг беларускіх пісьменнікаў у кіёску на станцыі Асіповічы? Аказваецца, раённае аддзяленне «Саюздруку» не заказала літаратуру з тэматычных планаў рэспубліканскіх выдавецтваў. Не паправіў раённае аддзяленне і яго кіраўніка тав. Іванова начальнік магілёўскага абласнога аддзела «Саюздрук» М. Швядко. І зразумела чаму. Сам абласны аддзел «Саюздруку» на мінулы год заказваў творы некаторых беларускіх пісьменнікаў па 10—20 экземпляраў, а часам і таго менш. Гэта ж нават па аднаму экземпляру на раён не прыходзіцца!

Такі ж «заказ» на літаратуру, якую выдае выдавецтва «Беларусь», аформіў абласны аддзел «Саюздруку» і на 1966 год.

Вось і атрымліваецца, што па віне работнікаў «Саюздруку» многія аматары літаратуры Магілёўскай вобласці не маюць магчымасці набыць патрэбную ім кнігу.

І. ЛУКАШЭВІЧ,
намеснік начальніка Беларускага падпіснога і рознічнага агенцтва «Саюздрук».

ЮНЫМ РАМАНТЫКАМ

Клуб Маладзечанскага станкабудаўнічага завода даўно стаў месцам, дзе любіць адпачываць моладзь горада.

Вельмі спадабаўся наведвальнікам вечар «Нам заўсёды свецяць зоркі бацькоў», на якім моладзь сустрэлася з былым камандзірам партызанскага атрада Аляксандрам Раманавым і былым камісарам брыгады імя Варашылава Аляксеем Шаўчэнкам.

Ёсць пры клубе нямала актывістаў, якія памагаюць наладжваць цікавыя вечары. Гэта кіраўнік мастацкай самадзейнасці Міхаіл Кухцікаў, токар зборачнага ўчастка Міхаіл Рудак, капіравальшчыца аддзела галоўнага канструктара Вольга Мандрык, электрык Аляксандр Летуноў, заводскія паэты Ірына Стальмакас і Спірыдон Ягорцаў.

Пры клубе працуе духавы і эстрадны аркестры, ёсць харавы, танцавальны і драматычны гурткі. Заводскія самадзейныя артысты часта выступаюць з канцэртамі на прадпрыемствах горада.

Ул. МАНГІНОВІЧ.

Далёка за межамі рэспублікі вядомыя работы самадзейнага скульптара Аляксандра Жываева, які жыве на станцыі Залессе Смаргонскага раёна. Многія яго работы экспаваліся ў Мінску, Гродна, а скульптуры «Цялятніца», «Пяюнка», «Выдатніца» — у Маскве. Зараз Аляксандр Жываеў працуе над партрэтам вядомага польскага кампазітара Агінскага, які некалі жыў і працаваў у Залессі.

Фота Ул. КРУКА.

ФЕСТЫВАЛЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ФІЛЬМАЎ

У мэтах шырокай прапаганды перадавога вопыту і дасягненняў агразаатэхнічнай навукі гэтымі днямі ва ўсіх сельскіх кінаўстаноўках рэспублікі пачынаецца фестываль сельскагаспадарчых фільмаў.

У дні фестывалю будзе дэманстравацца каля 300 хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных кінакарцін.

Працаўнікі вёсні прагледзяць кінастужкі «Спецыялізацыя—шлях да рэнтабельнасці», «Па ўраджаі і аплата», «Занятыя папары», «Глебавая карта», «Звяно высокіх ураджаяў», «Мікраарганізмы і ўрадлівасць глебы».

Шмат карыснага сельскім жывёлаводам раскажуць кінафільмы «Пароды буйнай рагатай жывёлы», «За высокі надой малака», «Развядзенне свіней».

У дні фестывалю на сельскіх экранах рэспублікі будуць таксама дэманстравацца кінафільмы па пытаннях земляробства, садоўніцтва, ветэрынарыі, меліярацыі.

Фестываль сельскагаспадарчых фільмаў прадоўжыцца да 30 красавіка.

ДРУГАЯ ПРАФЕСІЯ

У вялікім светлым пакоі, застаўленым пісьмовымі сталамі, часта чутны тэлефонныя званкі. Дзяўчына з залацістымі кучарамі здымае трубку.

—Каго? Калатушкіну? Галка, зноў цябе. Напэўна, кніга зноў некаму спатрэбілася.

На другім канцы провада чуваць голас:

— Сёння ў бібліятэку забегчы не паспеў. Калі ласка, пакінь мне Астроўскага «Як гартавалася сталь». Вельмі патрэбна.

«Анатоль Ахрамовіч вучыцца ў школе майстроў. Цяпер у іх экзамены, — успамінае Галя.—Трэба абавязкова знайсці яму кнігу».

І яна робіць запіс у фармуляры.

Чытач, напэўна, падумаў, што Калатушкіна — па прафесіі бібліятэкарка. Зусім не. Яна планіроўшчыца. Працуе на самым важным участку цэхавага планавання. Галя, як казначэй, падлічвае, колькі металу трэба выдаткаваць, колькі атрымаць яшчэ. Працуе яна добра.

Летась Галя скончыла курсы стэнаграфіі. Прапаноўвалі дзяўчыне добрае месца, ды не пакінула яна завода. Любіць Галя свой аўтамабільны, свой цэх.

Чатыры гады назад прыйшла ў аўтапрычэпны цэх, непрыкметная дзяўчынка. У абед усё кніжкі чытала. Брала іх у бібліятэцы заводскага Дома культуры. А калі ў цэху арганізавалі бібліятэку-перасоўку, запісалася туды першая. Прыйшла сюды неяк пасля работы.

— Што-небудзь добрае ёсць пачытаць? — спытала яна ў табельшчыцы Ніны Цалко, якая ўзялася была за бібліятэчную работу.

— Як бачыш, выбар невялікі,— паказала тая дзесяткі са два кніг.

— І гэта ўсё? — здзівілася Галя.

— Хопіць. Чытачоў жа таксама не багата, ды хто сюды пойдзе?

Да Ніны па кнігі сапраўды мала хто заходзіў. І працавала цэхавая бібліятэка раз-два на месяц. А потым Ніна і зусім закінула гэтую работу.

Неяк зайшоў сакратар партарганізацыі цэха ў вытворча-дыспетчарскае бюро, дзе працавала Калатушкіна, і прапанаваў ёй:

— Вось што, Галіна, кнігі ты любіш, а трэба, каб і іншыя ў нашым цэху іх палюбілі. Прымай у Ніны яе «гаспадарку».

І Галя прыняла 60 кніг і спіс чытачоў. Быў ён невялікі — толькі 45 чалавек.

Узялася Г. Калатушкіна за справу горача. Пасля работы заставалася ў чырвоным кутку, парадкавала кнігі, потым старанна напісала аб'яву. І на наступны дзень на кожным участку рабочыя чыталі: «Да ўвагі ўсіх, хто любіць чытаць. Сябры! Цэхавая бібліятэка запрашае вас! Прыходзьце!»

І рушылі людзі ў чырвоны куток, у цэхавую бібліятэку-перасоўку.

Першымі прыйшлі нарадчыцы Раіса Давыдкіна і Валянціна Захарава.

— «Мужнасць» Кетлінскай ёсць?

Галя пакруціла галавой.

— Няма, дзяўчаткі, вазьміце пакуль што-небудзь іншае, а гэтую кнігу я абавязкова дастану для вас.

Дзяўчаты пайшлі абнадзееныя. Але самі сабе падумалі: як бы не згас у яе запал праз тыдзень? А то зноў будзе на замку чырвоны куток.

Але калі ў наступны раз дзяўчаты прыйшлі ў бібліятэку, Галіна Калатушкіна прапанавала ім кнігу, якую абяцала дастаць.

Цяпер у аўтапрычэпным цэху шмат аматараў кнігі. 230 чытачоў!

Штодзённа ў абедзенны перапынак адкрываецца бібліятэка-перасоўка.

Зрэшты, цяпер Галя занята ў бібліятэцы не адна. У яе ўжо нямала памочнікаў. І па кнігі ў бібліятэку Дома культуры завода ходзіць Г. Калатушкіна ўжо не адна. Ёй памагаюць члены грамадскага савета цэхавай бібліятэкі-перасоўкі Валянціна Захарава, Раіса Давыдкіна, Валянціна Гайдашова. Часта застаюцца ў чырвоным кутку і іншыя дзяўчаты і хлопцы: памагаюць Галі рамантаваць кнігі, расстаўляць іх на паліцах.

Пажылыя рабочыя называюць бібліятэкарку ласкава — «дачушка». Але хоць яна маладая, ды ведае столькі цікавага, столькі кніг прачытала, што часам дзіўна, калі гэта яна паспела, як знайшла час для ўсяго. А ў Галі ж ёсць свая сям'я, пяцігадовы сын. Увечары Васілёк доўга чакае маму. Абяцала яна яму казку расказаць. У яе іх многа ў запасе. Сёння ж чамусьці затрымалася. А тата заняты, рыхтуецца да экзамену: ён вучыцца на чацвёртым курсе політэхнічнага.

Але вось і Галя. Проста з парога абвяшчае:

— Разумееш, Гена, бюро было...

Генадзь толькі махае рукою. Жонка ж у яго не толькі бібліятэкарка-актывістка. Трэці год яна — член цэхавога камсамольскага бюро, і ва універсітэт паступаць збіраецца. Ды Генадзь і сам ганарыцца тым, што жонка яго ўсюды паспявае.

...Перад сном Васілёк слухае абяцаную мамаю казку. Раніцаю яго адводзяць у дзіцячы сад. Калатушкіны-старэйшыя адпраўляюцца на завод. За прахадной яны расстаюцца. Генадзь ідзе ў эксперыментальны, дзе працуе слесарам-выпрабавальнікам, а Галя спяшаецца ў аўтапрычэпны...

Святлана ГЕБЕЛЕВА.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

НАШТО ДРУКУЮЦЦА КРЫТЫЧНЫЯ СІГНАЛЫ

Кабінет намесніка дырэктара кінастудыі «Беларусьфільм» І. Пастухова. Снежаньская раніца. За акном лютае зімовая завіруха, але ў кабінеце цёпла і ўтульна. У дзверы далікатна стукаюць.

— Заходзьце, — дазваляе гаспадар.

Заходзіць адзін з супрацоўнікаў. Паведамляе:

— А пра нас сёння фельетон.

—, Дзе?

— У газеце «Літаратура і мастацтва».

— А пра што?

— Пра ахову.

— Во, я так і ведаў, што дрэнна ахова працуе. Пільнасці не праяўляе. Пускаюць усіх, а потым непрыемнасці. Добра, напішам зараз адказ у рэдакцыю...

Можа такой размовы і не было, але ў нас на рэдакцыйным стале пісьмо за подпісам І. Пастухова. Яно варта таго, каб яго прывесці цалкам:

«Фельетон В. Забелы «Прафанацыя пільнасці» 21 снежня быў абмеркаваны на нарадзе работнікаў аховы кінастудыі «Беларусьфільм». Крытычныя заўвагі па пытанню недастатковай пастаноўкі аховы і пільнасці прызнаны правільнымі.

Перад работнікамі аховы пастаўлена задача строгага захавання ўстаноўленага парадку ўваходу на студыю пабочных асоб».

Паважаны тав. Пастухоў! Але ж фельетон і быў пра тое, што «ўстаноўлены парадак уваходу на студыю» нікуды не варты. Яшчэ раз напомнім, аб чым ішла ў ім гутарка.

У чалавека, які па нейкіх справах прыйшоў на Мінскую студыю тэлебачання, Беларускае радыё, на Студыю навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў (дарэчы, кіраўнікі гэтых арганізацый яшчэ зусім не адказалі на фельетон), на «Беларусьфільм», ля ўваходу абавязкова патрабуюць пропуск. Калі ж яго няма, дык наведвальніку трэба сазваніцца з рэдакцыяй, куды ён мае намер зайсці, каб адтуль далі каманду вахцёру прапусціць.

Мала таго, што ўся гэта не вельмі прыемная працэдура адбірае шмат часу, яна, па сутнасці, не мае ніякага сэнсу. Сапраўды, чаму гэта забараняць свабодны ўваход у рэдакцыі? Спасылаюцца на тое, што ў гэтых установах ёсць месцы, куды пабочным асобам сапраўды заходзіць нельга (каштоўная апаратура і г. д.). Але ж можна паставіць ахову іменна тут — і справе канец. А так тое, што трэба ахоўваць, пры такіх парадках на самой справе і не ахоўваецца, бо чалавек, які атрымаў дазвол на ўваход у памяшканне (а такі дазвол практычна атрымліваюць усе), затым ужо можа бесперашкодна хадзіць, дзе толькі яму захочацца.

Здаецца, усё ясна. Сэнс фельетона — кожную справу трэба рабіць з розумам. Гэта адносіцца і да рэагавання на крытычныя сігналы газеты. Ва ўсякім разе, перш чым рэагаваць на крытычныя сігналы газеты, яго трэба прачытаць.

САГРЭТАЯ ЛЮБОЎЮ

Алесь ПАЛЬЧЭЎСКІ

ДАНЕЎЦЫ — НАШЫ ЗНАЁМЫЯ

«Беларусь» 1965

Нічога незвычайнага ў гэтай аповесці няма. Падзеі, якія ляжаць у аснове яе, — звычайныя, можа, нават будзённыя. Самі героі — настаўнікі, школьнікі, вартаўнік, інжынер і г. д. — як у нас часта гавораць, звычайныя простыя людзі. І сюжэт аповесці небагаты крутымі віражамі. Пачынаецца аповесць з таго, што Васіль Пятровіч, інжынер-будаўнік, які працуе недзе ў Сібіры, прыязджае ў Мінск у госці да сваёй сястры. Сястра знаёміць яго з суседам па кватэры журналістам Аляксеем Васільевічам. Васіль Пятровіч прапануе новаму знаёмаму праехацца ў тыя мясціны, дзе некалі інжынер партызаніў. Прапанова прымаецца, і вось яны ў Даневе — вёсцы, дзе ў час вайны даводзілася часта бываць Васілю Пятровічу. У Даневе Васіль Пятровіч сустракае настаўніка Паўла Антонавіча — колішняга свайго добрага знаёмага. Госці спыняюцца ў яго.

Аднойчы ў часе прагулкі Павел Антонавіч і госці выпадкова падслухоўваюць гаворку двух выхаванцаў школы-інтэрната — Аліка і Мішы. Школьнікі гаварылі пра тое, што было б нядрэнна перагарадзіць данеўскі ручай і зрабіць возера.

Ідэя заманлівая. За яе хапаецца Павел Антонавіч, Васіль Пятровіч яго падтрымлівае; і вось ужо на беразе ручая кіпіць работа — ідзе будаўніцтва.

Мінае пэўны час — возера гатова. Госці пакідаюць Данева, а праз пару дзён Васіль Пятровіч развітваецца і з Мінскам.

Вось і ўся, можна сказаць, сюжэтная схема аповесці. Адным словам, паўтараем, нічога незвычайнага ў ёй няма. І ўсё ж чытаецца яна з цікавасцю. І «вінаваты» у гэтым, думаецца, галоўны герой твора інжынер Васіль Пятровіч, вакол якога групуюцца ўсе астатнія героі. Гэта цікавы чалавек. За плячыма ў яго нялёгкае і немалое жыццё. Ён — удзельнік партызанскай вайны, інжынер-будаўнік, які аднаўляў разбураны Мінск, а цяпер працуе ў Сібіры. Колькі рамантыкі ў яго працы — той рамантыкі, якая так падабаецца школьнікам!

Васіль Пятровіч — чалавек дзеяння. Замест таго, каб з вудачкай сядзець на беразе якой-небудзь рэчкі (усё ж ён прыехаў адпачываць) ці шукаць па лесе грыбы, ён актыўна ўключаецца ў, здавалася б, зусім непатрэбную яму, клопатную працу: капае разам са школьнікамі возера і вельмі (можна сказаць, па-дзіцячы) радуецца, калі гэта праца дае добрыя вынікі. Ён з ліку тых, хто ўсюды, куды б ні кінула яго жыццё, адчувае сябе як дома. І ў Даневе ён кіруе працай дзяцей не толькі таму, што ён інжынер-будаўнік па спецыяльнасці. Для яго няма дробных спраў. Спецыяліст, які прывык да вялікіх маштабаў вялікіх будоўляў, ён не баіцца «маламаштабнасці» работы на Сцёпкавым возеры.

Шкада толькі, што аўтар стараецца больш расказваць пра свайго героя, чым паказваць яго, і таму часта мы **не бачым** яго, не ведаем, што ён і як робіць, а толькі здагадваемся пра гэта.

Дарэчы, гэты недахоп — замена паказу расказам — у пэўнай меры ўласцівы ўсяму твору. Не зачапіў ён хіба толькі дырэктара школы-інтэрната Барыса Міхайлавіча. Пры абмалёўцы гэтага характару пісьменнік знайшоў неабходныя трапныя дэталі.

Запамінаецца, напрыклад, сцэнка, калі ў школу прыязджае Ірына Віктараўна — жанчына, якая некалі адцуралася свайго сына, а цяпер прыехала ў школу, каб забраць яго.

А такі штрышок: «Ці абедаў ты сёння?» — гэтым простым чалавечым пытаннем сустракае дырэктар Аліка, калі той уцякае ад маці ў школу-інтэрнат. Ужо адно гэтае пытанне многа гаворыць пра характар Барыса Міхайлавіча, пра яго адносіны да выхаванцаў.

З «дарослых» вобразаў хочацца яшчэ адзначыць вобраз старога вартаўніка Андрэя Лук'янавіча Жуковіча, якога ў Даневе празвалі «Як кажаце?» за тыя два словы, якімі ён звычайна суправаджае кожную сваю гаворку. Усяго ў некалькіх эпізодах ён удзельнічае, але і іх дастаткова, каб паказаць добрую, шчырую і шырокую натуру гэтага непрывабліваго знешне старога чалавека.

Не пашанцавала ў творы школьнікам. І Міша Расолька, і Алік (гэта іх спрэчку падслухалі ў пачатку аповесці Васіль Пятровіч і Павел Антонавіч) наўрад ці выклічуць асаблівае захапленне ў чытачоў, хоць у аповесці гэтыя хлапчукі робяць толькі дабро. Вобразы іх не індывідуалізаваны. Гэта хутчэй не канкрэтныя жывыя хлапчукі, а школьнікі ўвогуле. Усё ім даецца вельмі лёгка. Не паспелі яны ўзяцца за тапары і лапаты, каб выкарчаваць пень дуба, глядзіш — ён ужо ляжыць на баку. Нават і кроплі поту не змахнулі з ілба. А дуб жа быў, піша аўтар, «магутны». А ў магутнага дуба, відаць, былі магутныя і карэнні.

Відаць, не варта было ўводзіць у аповесць Ганну Пятроўну — сястру Васіля Пятровіча. Яна і ўпамінаецца ў творы ўсяго два разы — у самым пачатку і ў самым канцы. Выпадкова трапіў у Данева і журналіст Аляксей Васільевіч.

Аповесць населена многімі людзьмі. Яны (апрача Васіля Пятровіча і Аляксея Васільевіча) жывуць і працуюць у адной і той жа школе. А чытаеш твор і часам складваецца ўражанне, што героі як бы ізаляваны адзін ад другога. Ёсць людзі, а няма калектыву, ёсць вучні, настаўнікі, а няма школы.

Гэта — недахопы, і яны, безумоўна, не маглі не знізіць агульнай вартасці твора.

Хочацца сказаць яшчэ пра чыста выхаваўчае значэнне аповесці. Яе з карысцю для сябе прачытаюць многія настаўнікі. Яна не толькі вучыць іх быць вельмі далікатнымі, асцярожнымі пры рабоце з такім тонкім «матэрыялам», як дзеці. Яна вучыць іх бачыць у кожным дзіцяці чалавека, душа якога аднолькава даверліва адкрыта і дабру і злу.

У кароценькай анатацыі, якая папярэднічае твору, ёсць такія словы: «Кніга сагрэта шчырай любоўю аўтара да дзяцей, да людзей працы». Прачытаўшы кнігу, пагаджаешся з гэтым.

А. КУДРАВЕЦ.

ПРОСТА І ПЕРАКАНАЎЧА

Я. КАЗЕКА

КАНДРАТ КРАПІВА

«Беларусь» 1965

У крытыка-біяграфічным нарысе «Кандрат Крапіва», які выйшаў летась у выдавецтве «Беларусь», Янка Казека вельмі слушна піша пра байкі Крапівы: «...як непадобны гэтыя байкі на прасталінейныя, прымітыўныя прытчы з іх дробным маралізаваннем, якіх, на жаль, нямала друкуецца цяпер!» Гэтую заўвагу ўспрымаеш не як імкненне прынізіць сучасную байку, а як жаданне падкрэсліць сілу і значэнне баек К. Крапівы. Сапраўды, мінула шмат часу, адбылося шмат падзей, вырасла літаратура, больш культурны і патрабавальны стаў чытач, але байкі К. Крапівы не страцілі сваіх вартасцей, іх з захапленнем чытаеш і ўспрымаеш так, быццам напісаны яны сёння. Яны адкрывалі і адкрываюць для нас свой непаўторны свет, самабытныя і характэрныя праявы нашага жыцця гадоў станаўлення Савецкай улады. І крытык не без падставы сцвярджае, што К. Крапіва не падносіў чытачу прапісных ісцін, чым нярэдка займаюцца байкапісцы, а падаваў рэальныя малюнкі жыцця, з якіх натуральна вынікалі павучальныя вывады.

Я. Казека як бы прыадкрывае заслону, зазірае ў творчую лабараторыю пісьменніка, імкнецца высветліць, чаму такія папулярныя і «жывучыя» яго цудоўныя байкі, і робіць правільны вывод: прычына гэтага — у глыбокім веданні жыцця, у разуменні тых сацыяльна-гістарычных працэсаў, што адбываліся ў той час, і, само сабой разумеецца, у самабытным, народным таленце аўтара.

Я. Казека разглядае жыццёвы і творчы шлях пісьменніка як адно цэлае, арганічнае, звязвае ўзнікненне таго ці іншага твора з пэўнымі працэсамі развіцця нашага грамадства, з літаратурнымі пошукамі пісьменнікаў розных пакаленняў, абумоўленымі бурным развіццём беларускай літаратуры і культуры. Гэта датычыцца разгляду і баек, і прозы, і драматургіі К. Крапівы.

Вядома, што ў свой час на пісьменніка рабілася нямала вульгарызатарскіх наскокаў. Асабліваму «абстрэлу» падвяргаліся раман «Мядзведзічы» і некаторыя драматургічныя творы. І тут вялікая заслуга крытыка ў тым, што ён правільна разабраўся ў літаратурным працэсе таго часу, асвятліў яго па-новаму, з сучасных пазіцый.

Праўда, што датычыцца разгляду драматургіі К. Крапівы, то тут, мне думаецца, крытык залішне абмяжоўвае сябе, залішне гаворыць скорагаворкай. Магчыма, тут адыграла ролю тое, што пра драматургію пісьменніка шмат пісалася, ёсць нават спецыяльная манаграфія Я. Усікава. Усё ж сказаць трэба было значна больш і значна шырэй.

Крытыка-біяграфічны нарыс «Кандрат Крапіва» напісаны з вялікай любоўю да літаратуры і да творчасці пісьменніка. Чытаецца нарыс нібы мастацкі твор, нібы аповесць пра чалавека, пра яго жыццёвы і творчы шлях. Мова нарыса простая, але каларытная і сакавітая, думкі крытыка выказаны ясна і пэўна, пацверджаныя і багатымі прыкладамі з твораў і канкрэтнымі з'явамі жыцця.

Нарыс Я. Казекі карысна будзе прачытаць і маладому літаратару, і студэнту, і выкладчыку літаратуры, і проста чалавеку, які любіць і шануе нашу літаратуру.

Рыгор НЯХАЙ.

АБ РОДНАЙ ПРЫРОДЗЕ

Зіма. Завіруха ў лесе. Але вось вылецела з гнязда маленькая птушка. Гэта самка крыжадзюба-елавіка, якая выседжвае яйкі нават у зімовы час. Цікава?

А куды адлятаюць птушкі? Як сябе адчуваюць у нас звяры-навасёлы? На гэтыя і іншыя пытанні дапамагае знайсці адказ «Школьны каляндар прыроды», які нядаўна выпушчаны ў свет выдавецтвам «Народная асвета».

Аўтар кнігі — вучоны сакратар аддзела заалогіі і паразіталогіі АН БССР А. Н. Курсноў — ярка і вобразна расказвае пра жывёльны і раслінны свет рэспублікі, пра цікавыя з'явы прыроды, пра формы і метады фенералагічных і метазералагічных назіранняў у школе.

У кнізе больш пяцідзесяці малюнкаў, удала выкананых мастаком В. Ціхановічам.

«Парады кветкаводам» — так называецца кніга, выдадзеная выдавецтвам «Ураджай». Яе аўтар — кандыдат біялагічных навук А. С. Мярло. Яна піша пра навейшыя спосабы вырошчвання кветак, пра мікраўгнаенні і іх уплыў на развіццё і ўраджайнасць раслін, пра чаранкаванні флоксаў, пра безрасадную культуру летнікаў і г. д. Кніга багата ілюстравана.

Цікавасць у аматараў прыроды выклікіла таксама кніга «Грыбы нашых лясо». Аўтары гэтай працы З. Н. Кудраўцава, Г. І. Сяржаніна, В. М. Туткевіч і Ф. Ф. Захарыч.

У бліжэйшы час выходзіць з друку брашура «Запаведнік на Бярэзіне».

П. БАРЫСАЎ.

1935 г. Масква. Максім Горкі развітваецца з Рамэнам Раланам.

Вечар, прысвечаны Рамэну Ралану

25 студзеня ў акруговым Доме афіцэраў адбыўся агульнагарадскі вечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння Рамэна Ралана. Адзначыць юбілей вялікага друга Савецкага Саюза, выдатнага французскага пісьменніка прыйшлі прадстаўнікі грамадскіх і культурных арганізацый, пісьменнікі, мастакі, кампазітары, вучоныя, педагогі, рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі, студэнты.

У прэзідыуме вечара — сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР А. І. Золаў, міністр замежных спраў БССР К. В. Кісялёў, міністр культуры БССР М. А. Мінковіч, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР Кандрат Крапіва, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР П. У. Броўка, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі В. С. Смірноў, акадэмік АН БССР П. Ф. Глебка, пісьменнік І. П. Шамякін, народны артыст БССР С. С. Бірыла і іншыя.

Адкрываючы вечар, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Пятрусь Броўка адзначыў, што творчасць Рамэна Ралана з'яўляецца велізарным укладам у скарбніцу сусветнай літаратуры.

Старшыня Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Францыя» пісьменнік Іван Мележ выступіў з дакладам «Вялікі пісьменнік і друг». Ён расказаў аб разнастайнай творчай спадчыне Рамэна Ралана, які стварыў выдатныя па форме і змесце творы літаратуры і даследаванні ў галіне музыкі.

БЕЛТА.

ЧАЛАВЕК ЧАЛАВЕЦТВА

Іван МЕЛЕЖ

ЧАЛАВЕК звязаны з часам, у які жыве. Гэта — ісціна, што мае дачыненне да звычайнага чалавека. Гэта асабліва важна для разумення тых людзей, якім жыццё краіны, свету становіцца асабістым жыццём.

Жыццё Рамэна Ралана — гэта жыццё чалавека, які жыў радасцямі і трывогамі свайго народа, жыццём усяго свету. Пра яго, як мала пра каго, з поўным правам можна сказаць — гэта быў у самым высокім значэнні «грамадзянін свету».

Які ж той час, калі рос, жыў, радаваўся і трывожыўся Рамэн Ралан? Давайце разам з памяццю, па тых сцежках, што адзначылі нам яго раўесні, яго паплечнікі, пераступім ужо далёкі рубеж стагоддзя, прыгледзімся да часу, у які выходзіў у жыццё будучы пісьменнік.

Адразу заўважым: малы, пяцігадовы сын натарыуса са старажытнага гарадка Кламсі ў сэрцы Францыі, у правінцыі Бургундзіі, чуў гром кананады вакол Парыжа. Успамін пра гэты гром будзе жыць у ім усё немалое жыццё; пісьменніку давялося быць сведкам адной з самых трагічных падзей французскай гісторыі — гібелі Парыжскай камуны.

Ужо дарослы — неспахойны і пільны — ён сярод ускаламучанага мора страсцей, якое заліває вуліцы і плошчы французскай сталіцы ў дні справы Дрэйфуса. Зусім сталым і ўжо далёка вядомым аўтарам «Жана Крыстофа» Рамэн Ралан апынуўся ў новым шторме, які ўзняла першая сусветная вайна. Праз некалькі гадоў, вельмі неспакойных і напружаных, сведку гібелі Парыжскай камуны суджана было ўбачыць у моры цемры зарыва надзеі. Суджана ўбачыць перамогу той справы, якую пачынала Камуна, — у швейцарскі гарадок на беразе жэнеўскага возера Вільнёў, які на доўгія гады стаў родным горадам Рамэна Ралана — прыйшла вестка пра рэвалюцыю ў Расіі.

Ужо немаладым, загартаваным байцом, Рамэну Ралану даводзіцца заўважыць набліжэнне каламутнай, пагрознай хвалі, што насоўвалася на Еўропу. Ён бачыў, як расце і шырыцца гэтая хваля фашызму і вайны. Бязлітасны лёс даў зазнаць ужо састарэламу пісьменніку горыч расчараванняў і паражэнняў: германскія, гітлераўскія войскі ўварваліся ў Францыю, захапілі Парыж. Давялося ўбачыць самае жахлівае, што толькі магло быць: Францыя капітуліравала.

Былі дні, гады адчаю. Але ўсё ж суджана было старому пісьменніку ўбачыць і тое, як фашызм пачаў адпаўзаць, саступаць, набліжацца да гібелі. У 1944 годзе, у снежні, Рамэн Ралан прыйшоў у вызваленым Парыжы ў савецкае пасольства, каб павітаць сваіх савецкіх братоў, перажыць разам з імі радасць перамогі. Гэта было ўсяго за месяц да смерці нашага друга.

Такі час, у які жыў пісьменнік. Амаль восемдзесят гадоў Рамэн Ралан быў сведкам і ўдзельнікам складаных, зломных падзей. Кіпенне, барацьба, павароты, выбухі,—мала каму ў мінулыя часы выпадала столькі на адно жыццё. Але наколькі важчэйшым быў гэты цяжар чалавеку, якому ўласным жыццём было жыццё народа, жыццё свету!

Самы пачатак жыцця пісьменніка нібы зусім не прадракаў таго, якой крутой, камяністай будзе далейшая дарога. Выхаванец парыжскай «Эколь нармаль» упарта працаваў над гісторыяй музыкі, даследаваў дзейнасць музыкантаў мінулага і сучаснасці. Цікавасць да музыкі будзе ў Рамэна Ралана ўсё жыццё, усё жыццё ён будзе даследаваць творчасць Бетховена; але — ёсць весткі — ужо ў тыя маладыя гады Ралан жыве не адной гісторыяй музыкі, дапытліва, напружана будучы пісьменнік думае — як жыць, як быць? Гісторыя захавала нам красамоўны факт: дваццацігадовы юнак з Нармальнай школы ў Парыжы піша два лісты вялікаму мудрацу з Яснай Паляны, у якіх дзеліцца сваім роздумам над жыццём, над сэнсам чалавечай дзейнасці, просіць парады...

У трыццаць гадоў неспакойны розум зусім разрывае межы музычнадаследчай працы, узрадавана, прагна аддаецца жывым, хвалюючым творчым клопатам. Адна за адной з-пад хапатлівага, нястрымнага пяра пісьменніка выходзяць драмы, якія аб'ядноўваюцца ў цыкл «Трагедыя веры». Яшчэ не закончыўшы гэтага, ён стварае новы цыкл драм — «Драмы рэвалюцыі». Усіх, хто чытае жыццё Рамэна Ралана, — уражвае надзвычайная творчая энергія, з якой заявіў пра сябе малады французскі пісьменнік. Ужо ў гэтых драмах, пры ўсіх асаблівасцях іх канцэпцый, адчуваецца асноўная накіраванасць творчай зацікаўленасці пісьменніка: малады Рамэн Ралан усё больш заяўляе пра сябе як пясняр гераізму чалавека. Гераізм у яго разуменні, праўда, яшчэ звычайна носіць абстрактны, «духоўны» характар, гэты гераізм духу расплываецца ў такім жа невыразным буржуазна-інтэлігенцкім гуманізме; але пры ўсім тым гераічная тэма ўсё мацней становіцца галоўнай тэмай яго творчасці. Гэты кірунак замацоўвае лепшая з яго ранніх драм «Чатырнаццатае ліпеня», дзе героем твора Рамэн Ралан робіць народ, шо штурмуе Бастылію. У гэтым тоне акрэсліваецца і вобраз Жана Крыстофа, які ўсё больш захапляе творчае ўяўленне пісьменніка. Захапленне гераічным, веліччу духу і дзейнасцю чалавека выклікала і з'яўленне — паралельна з кнігамі «Жана Крыстофа» — цыкла біяграфій «Гераічнае жыццё»: «Жыццё Бетховена», «Мікеланджэла», «Жыццё Талстога». Асноўную энергію ў, гэты — даваенны — перыяд Рамэн Ралан аддае самаму значнаму твору — эпапеі «Жан Крыстоф», якая як бы канцэнтравала ў сабе самыя дарагія, самыя важныя думкі пра жыццё, пра час, пра прызначэнне чалавека і мастацтва ў грамадстве. «Жан Крыстоф» — найбольшае дасягненне Рамэна Ралана і самая магутная песня чалавечаму гераізму, яго творчым сілам.

У асноўнай плыні трэба бачыць і з'яўленне вельмі арыгінальнай, нібы нават неспадзяванай сваёй народнай, грубаватай сакавітасцю аповесці «Кала Бруньён»; вясёласць, жывасць, разважнасць галоўнага вобраза аповесці — як бы своеасаблівае выяўленне народнага гераізму.

У жыцці кожнага чалавека бываюць такія хвіліны, калі яму належыць прымаць важныя рашэнні. Адным з такіх, асабліва сур'ёзных выпрабаванняў былі для Рамэна Ралана гады першай імперыялістычнай вайны. Каб зразумець усю складанасць становішча Рамэна Ралана і ўсё значэнне рашэння, якое ён выбраў, трэба ўявіць усю тую ваяўнічую слепату, увесь той шавіністычны чад, якім былі напоўнены і галовы тых, хто кіраваў палітыкай тагачаснай Францыі, і галовы многіх і многіх людзей мыслі. Можа быць ніколі ні адзін учынак дагэтуль не патрабаваў ад Рамэна Ралана такой яснасці думкі і цвёрдасці духу, такой адвагі, як выступленне яго супраць імперыялістычнай вайны. Ні адно яго выступленне раней не выклікала такой злоснай, раз'юшанай лаянкі; дзесяткі артыкулаў і брашур аблівалі яго граззю, як антыпатрыёта, здрадніка Францыі. Ад Рамэна Ралана адвярнуліся многія нават з тых, каго ён мог лічыць сябрамі.

Усё ж ён не быў зусім адзінокі. У той час, як здраджвалі адны, другія цягнуліся да яго з дружбай і верай. Можна сказаць, ніколі дасюль не ўздымаўся Ралан так высока перад вачмі лепшых людзей свету, перад вачмі мільёнаў людзей, што гінулі на палях сусветнай бойні, людзей, што прагнулі міру і жыцця сваім блізкім, сабе.

Рамэн Ралан не да канца разумеў і прычыны вайны і тыя шляхі, якія маглі б прывесці чалавецтва да лепшага ладу жыцця. Яго разуменне прычын вайны было ў многім ідэалістычнае: галоўную віну за ваенныя канфлікты ён бачыў у нягодных ідэалах, якімі палітыкі поўняць галовы людзей, супроцьпастаўляючы народы народам. Уся надзея Рамэна Ралана была звернута толькі да інтэлігенцыі, якая, на яго думку, павінна раскрываць людзям сэнс вайны. Пройдзе час, і Рамэн Ралан зразумее глыбей і зманлівасць сваіх вывадаў, і недастатковасць той сілы, на якую ён спадзяваўся; пройдзе час, і Рамэн Ралан інакш гляне на значэнне ў барацьбе з вайной тых, хто гібее і гіне ў акопах. Але тут хочацца асабліва адзначыць тое, што ў цяжкія дні, калі патрэбна было багата мужнасці, калі на праверку ставілася сумленне, Рамэн Ралан вытрымаў выпрабаванне з гонарам: у яго хапіла мужнасці, і ён не пакрывіў сумленнем, — словам сваім, жыццём сваім ён паказаў гатоўнасць служыць людзям да канца.

Канстанцін Федзін вельмі справядліва сказаў пра Рамэна Ралана: «Яго постаць узвышаецца над пярэднімі радамі мыслячага чалавецтва, і яна асабліва вырастала ў ракавыя часы крызісаў. Яго голас быў не заўсёды моцным, але заўсёды чыстым, і гэта чысціня прарывалася праз грукат вайны, або пусты тлум бульвараў, або дурманлівую балбатню палітыканаў».

Жыццё, калі яно пражыта, калі яго чытаеш як гатовую кнігу, асабліва, калі гэта кніга напісана іншым чалавекам,—здаецца рэччу на дзіва простай. Але не будзем забываць: час, у які жыў Рамэн Ралан, быў вельмі складаны, дарогі, на якія ён ступаў, былі блытаныя, нявідныя далёка. Яму ўсё жыццё даводзілася шукаць. Яму нярэдка даводзілася ісці наперакор многім іншым, у тым ліку сябрам. Ён нямала памыляўся, ашукваўся ў каштоўнасці таго, што знаходзіў. Але які б ні быў звілісты шлях яго, гэта шлях пошукаў чалавека, што любіў людзей і дбаў аб іх, шлях чалавечага сумлення ў пошуках справядлівасці. Ён быў пільны да ўсяго, што адбывалася ў свеце. Сумленне яго ўвесь час патрабавальна назірала, адзначала, ацэньвала. Не ўсё было адразу зразумела яму. Ён вагаўся нярэдка. Мы ведаем, што Рамэн Ралан быў другам нашай краіны, што ён адразу вітаў рэвалюцыю ў Расіі, але было б спрашчэннем думаць, што дружба гэта была адразу ясная і глыбокая. У імя праўды трэба сказаць, што Рамэн Ралан доўга з насцярожанасцю прыглядаўся да нашай дзяржаўнай арганізацыі. Заходні інтэлігент, звыклы больш за ўсё берагчы свабоду асобы, ён з апаскай ставіўся да ўсяго, што магло абмежаваць гэту свабоду асобы. Разумеючы разам з тым неабходнасць рэвалюцыйнай пераробкі жыцця, спрабуючы стварыць адзінае разуменне свету, ён доўгі час імкнуўся злучыць у адно рэвалюцыйную ленінскую філасофію з філасофіяй Гандзі, з талстоўскім «непраціўленцтвам».

Каля дзесятка гадоў жыў Рамэн Ралан, адчуваючы трывожную несуладнасць у думках, у поглядах, трывожную насцярожанасць пры назіранні над тым, што робіцца ў Еўропе, у свеце. Гэта было доўгае і цяжкае дзесяцігоддзе пошукаў, якое прывяло, нарэшце, к творчаму ўздыму 30-х гадоў. 30-я гады — час самай актыўнай грамадскай дзейнасці Рамэна Ралана. Ёсць падставы лічыць, што к гэтаму часу завяршыўся доўгі і пакутлівы шлях перараджэння сумленнага буржуазнага інтэлігента ў інтэрнацыяналіста, байца самай рэвалюцыйнай сілы ў Еўропе. Як асобую заслугу Рамэна Ралана мы заўсёды будзем помніць тое, што пільны французскі пісьменнік адным з першых пачуў пагрозу, якую нясе Еўропе і свету расізм, фашызм. Вялікі гуманіст не прызнаваў расізму, шавінізму, якім бы адзеннем, якімі б фальшывымі, прыгожымі словамі яны не прыкрываліся. Ён адвяргаў як самае дзікае сучаснае варварства і стараннi паставіць, быццам адзіную надзею, месію, еўрапейскі кантынент над іншымі, і такія ж дзікія замашкі паставіць вышэй за іншыя якую-небудзь нацыю. З цвёрдасцю заявіў ён, што не прызнае ні народа-выбранніка, ні касты-выбранніцы. Гэта была заява, якая біла прама па расавых тэорыях, па фашызму.

Але Рамэн Ралан ваяваў з фашызмам не толькі словам. Яшчэ ў 1926 годзе разам з Анры Барбюсам Рамэн Ралан арганізаваў «Міжнародны камітэт барацьбы з фашызмам», які быў адным з першых арганізаваных выступленняў у Францыі і ў свеце супраць італьянскага фашызму. Летам 1932 года, калі над палямі Еўропы ўстала, не тулячыся, звярыная, ваяўніча ашчэрапая постаць нямецкага фашызму, Ралан з Барбюсам арганізаваў Міжнародны кангрэс супраць пагрозы вайны. Чым больш расла пагроза ў Еўропе, тым больш раслі мужнасць і адвага ў гэтым кволым з выгляду, хваравітым целам сутуляватым чалавеку з яснымі блакітнымі вачыма.

Гэта былі выдатныя дні ў жыцці Рамэна Ралана, выдатныя дні ў жыцці Францыі. Гэта былі дні народнага фронту. Кіпенне, сіла народнага мора акрылялі і падымалі пісьменніка.

Ёсць вялікае хараство не толькі ў мужнасці пісьменніка, але і ў яго надзвычайнай сумленнасці, або — гаворачы сучаснай мовай — прынцыповасці пісьменніка. Яго не страшылі пагрозы, але яго не збівалі і ліслівыя подкупы. Калі правіцелі гітлераўскай Германіі паспрабавалі задобрыць небяспечнага француза ўзнагародай — медаллю Гётэ, Ралан з гневам адмовіўся ад узнагароды, на ўвесь свет аб'явіўшы пры гэтым гітлераўскую палітыку злачынствам...

У гэтыя трывожныя дні Рамэн Ралан з асаблівай увагай глядзіць на нашу краіну. Даўняя сімпатыя да Савецкай краіны цяпер зліваецца ў Ралана з надзеяй, што Савецкі Саюз вялікі і моцны саюзнік тых, хто змагаецца з пагрозай фашызму. «Я разам з тым народам і класам, які пракладвае рэчышча плыні чалавечай гісторыі, разам з арганізаванымі масамі пралетарыяту, разам з Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік»... У 1935 годзе Рамэн Ралан, які даўно ўжо не рабіў падарожжаў, не зважаючы на свае хваробы, пакідае ціхі Вільнёў і ажыццяўляе дарагое жаданне — елзе ў нашу краіну. Людзі старэйшага ўзросту добра помняць, з якой любоўю сустрэлі вялікага друга свайго нашы людзі, у тым ліку мінчане, некаторыя з якіх — пісьменнікі — сустракалі Ралана ў Негарэлым, гутарылі з ім на мінскім вакзале, па-сяброўску праводзілі ў Маскву.

Сустрэча гэта не расчаравала ні нашых людзей у Ралане, ні Ралана ў нашых людзях, у нашай краіне. Вярнуўшыся з Масквы, ён з захапленнем пісаў пра Савецкую краіну як пра вялікую армію, «з перамогай якой звязаны лепшыя надзеі свету».

Калі акідваеш позіркам усё, што зрабіў за сваё неспакойнае, не надта спрыяльнае для творчай працы жыццё Рамэн Ралан, мімаволі бярэ здзіўленне і захапленне: як багата падарылі людзям яго талент, яго сэрца, яго рукі. Рамэн Ралан — вялікі працаўнік. Нават у французскай літаратуры, якая ведала Бальзака, Заля, Гюго, постаць Рамэна Ралана ўражвае творчай магутнасцю.

Цыкл драм, цыкл мастацкіх біяграфій «Гераічнае жыццё», дзесяцітомны, сабраўшы фарбы некалькіх дзесяцігоддзяў нямецкага, французскага жыцця «Жан Крыстоф»—адзін з буйнейшых твораў сусветнай літаратуры XX стагоддзя, многія кнігі публіцыстыкі, творы па эстэтыцы, даследаванні па музыцы, даследчая эпапея пра Бетховена і, нарэшце, «Зачараваная душа», якая, як вяршыня, узнялася побач з «Жанам Крыстофам», і якая сведчыла пра неаслабную сілу таленту і духу, пра творчую маладосць вялікага чалавека на сёмым дзесятку гадоў жыцця.

Музыказнаўца-вучоны, творца-пісьменнік, публіцыст-баец. Неяк не хочацца верыць у тое, што ўсё гэта зрабіў кволы чалавек, якому ўсё жыццё даводзілася дужацца з бясконцымі хваробамі. Але гэта разам з тым выклікае і іншую думку, думку гонару і захаплення: якую трэба было мець моц духу, якое вялікае трэба было мець сэрца, якой вялікай любоўю да людзей трэба было жыць, каб столькі даць ім, каб так узбагаціць іх... Мімаволі хочацца паставіць яго ў адзін рад з тымі, каго ён услаўляў. Думаецца, ён мае права, каб і яго жыццё было пад знакам — «Гераічнае жыццё»...

Рамэн Ралан адзін з тых, у кім адбіліся свет і лёс многіх за многія гады. У жыцці Рамэна Ралана адбілася цэлая эпоха вельмі важнага, складанага жыцця, эпоха, вяршыня якой дакранаецца да нашых, сённяшніх дзён. І калі мы цяпер адзначаем стагоддзе з дня нараджэння пісьменніка, калі пачатак жыцця яго зусім натуральна мы адчуваем як няблізкую і па часе, і па клопатах гісторыю, то пазнейшыя гады яго жыцця зліваюцца з гадамі нашага ці нашых трохі старэйшых сяброў юнацтва або сталасці, хвалююць як клопаты і трывогі блізкія, гарачыя, як трывогі нашага — зусім жывога — сучасніка. Гэта акалічнасць кожнай нашай сустрэчы з Рамэнам Раланам надае асаблівае значэнне: мы сустракаемся не толькі з гісторыяй, мы сустракаемся разам і з явай, яшчэ вельмі блізкай, вельмі жывой для таго, каб быць толькі гісторыяй. Ушаноўваючы гэту дату, мы быццам ушаноўваем наша нядаўняе, сённяшняе, ушаноўваем з самым чулым, самым сардэчным, самым трапяткім хваляваннем.

Чалавек і час. Мы казалі пра тое, што чалавек залежыць ад часу. У гэтым толькі частка праўды. Разам з тым бясспрэчна і тое, што час таксама залежыць ад чалавека. Асабліва ад вялікага чалавека. У тым добрым, што прыйшло ў жыццё часу, у эпоху ад чалавека, ад народаў, ёсць немалая заслуга Рамэна Ралана. Ралана — пісьменніка, Ралана — гуманіста, Ралана — рэвалюцыянера-барацьбіта.

За ўсё гэта чалавецтва доўга будзе помніць і шанаваць вялікага, высакароднага сына Францыі. За ўсё гэта разам з чалавецтвам аддаём яму даніну пашаны мы, савецкія людзі.

ЛІТАРАТУРНЫЯ ПАРОДЫ

Язэп ТАЎШЧЭЗНЫ

НА ПРЫПЫНКУ ЧАКАЕ ТРАЛЕЙБУС

Міхась СТРАЛЬЦОЎ

(АПАВЯДАННЕ).

Усё было як і ўчора, і ўсё пачыналася спачатку.

Раніцой паволі ўзыходзіла сонца. Як і ўчора, як пазаўчора. Пэўна, вечарам, па надакучлівай звычцы, яно зноў будзе апускацца за небасхіл. Усё было як і ўчора, і ўсё пачыналася спачатку...

На кухні жонка бразгае посудам, рыхтуючы сняданак. І ад гэтага няўмольнага бразгатання мяне апаноўвае невыказная туга. Чаму зімой наступае зіма, а летам — лета? — думаю я, і мне міжволі робіцца сумна. Чаму жонка заўсёды раніцай рыхтуе сняданак, а ўвечары — вячэру, а не наадварот? Хай бы вясна хоць раз наступіла восенню, а восень — увесну?

Усё было як і ўчора, і ўсё пачыналася спачатку. У магазіне зноў будуць прадаваць «Шыпку» і хаця б табе раз — «Манблан». Ёсць ад чаго прыйсці ў роспач і напісаць апавяданне...

Усё было як і ўчора. Горш таго — усё пачыналася спачатку. Але я ўжо не думаю аб тым, што вечарам зноў з выклікам запаляцца зоркі, а сонца, хаваючы ў сваёй залатой кішэні дулю, зноў пойдзе за небасхіл. Я думаю пра яго, пра блакітны, як вецер, дрогкі тралейбус, які чакае мяне яшчэ з учарашняга дня на замарожаным прыпынку. Я ўсё ведаю пра яго, пра тралейбус. Ён чакае мяне на Круглай, без мяне ён не кранецца з месца. Настылая кандуктарка невядомых гадоў, у «павуцінцы», лайкавых пальчатках і самаробным кажусе будзе доўга лічыць грошы, складваючы медзь у адну вялізную сумку, а сярэбраныя манеткі — у другую. І я ведаю, што будзе далей. Я зайду ў блакітны, у стракатых яблыках тралейбус, і ён кранецца з месца. Кандуктарцы патрэбен план, а ў мяне няма праязнога. І мне робіцца сумна-сумна — не ведаю ад чаго, але гэтай маёй тугі хопіць яшчэ на дваццаць апавяданняў...

ТАЙНА

Барыс САЧАНКА

(НАВЕЛА)

Хвядос Курылёнак лічыцца ў нашай вёсцы неблагім чалавекам, той-сёй беспадстаўна лічыць яго працавітым, маўляў, у мінулым невысакосным годзе Курылёнак выпрацаваў 366 працадзён. І ніхто, ніхто з усёй вёскі не ведае, якую жудасную тайну хавае гэты Хвядос, які ён у сапраўднасці агідны і хцівы.

**Нядаўна бацька мой папрасіў у Курылёнка агуркоў пад закусь, і Курылёнак даў іх бацьку, хаця ў самога тых агуркоў было небагата. Бацька не мог нахваліцца Курылёнкам: бачыце, добры ён сусед і не сknара, ды і не п'е зусім. А я, хапіўшы глечык матулінага першака і хрумскаючы Хвядосавым агурком, плакаў, бы хлапчанё, бо ведаў усю праўду, горкую і цяжкую, ведаў жудасную Курылёнкаву тайну. Я падгледзеў яе на Спаса ў лазні, калі ўсе мужчы

ПРА ЧАС І ЛЮДЗЕЙ МОВАЮ КІНО

«Масфільм» сёння — гэта буйнейшая кінастудыя краіны. Яе творчы калектыў налічвае звыш чатырох тысяч чалавек. На працягу года мы здымаем некалькі дзесяткаў карцін. Невялікая частка іх ствараецца па заказе Цэнтральнага тэлебачання, а пераважная большасць стужак прызначана для шырокай дэманстрацыі на экранах.

Расказваць пра час, пра чалавека мовай кіно — у гэтым мы бачым сваю асноўную творчую задачу. І зусім заканамерна, што больш як тры чвэрткі карцін мінулага года прысвечаны сучаснай тэме, людзям сённяшняга дня. Іх вызначальная асаблівасць — вялікая тэматычная і жанравая разнастайнасць.

Што ж уяўляюць сабою фільмы, работа над якімі завершана ў апошні час на нашай студыі? Пастараюся расказаць пра іх больш падрабязна.

«Наш дом» — так называецца шырокаэкранны фільм, пастаўлены рэжысёрам Васілём Проніным па сцэнарыі Яўгена Грыгор'ева. Мне думаецца, што гэта адзін з лепшых фільмаў 1965 года. Ён апавядае пра радавую савецкую сям'ю, на чале якой стаіць просты сціплы працаўнік. Яго ролю іграе таленавіты акцёр Анатоль Папанаў. Праўдзіва паказана вялікае, складанае жыццё сям'і, члены якой—людзі з разнастайнымі інтарэсамі і складанымі характарамі. Стары кадравы рабочы, які прайшоў вялікі жыццёвы шлях, выхоўвае ў сваіх сыноў любоў да працы, імкненне да высокіх ідэалаў.

Новая карціна «Будуецца мост» перш за ўсё цікавая тым, што ў пастаноўцы яе ўдзельнічаў амаль увесь калектыў тэатра «Сучаснік» на чале з галоўным рэжысёрам Алегам Яфрэмавым. У гэтым фільме ён упершыню выступіў у якасці кінарэжысёра, здымаючы яго ў садружнасці з кінааператарам Гаўрылам Егіязаравым. Ролі галоўных герояў і амаль усіх другарадных персанажаў выконвалі артысты тэатра «Сучаснік», якія выступілі, як мне здаецца, добра зладжаным адзіным ансамблем.

Падобны вопыт садружнасці кінематаграфістаў з тэатрам з'явіўся надзвычай плённым. Аўтараў фільма і акцёрскі склад прывабіла ідэя стварэння сучаснай карціны пра мостабудаўнікоў, якія ўпершыню прымянялі навейшыя метады ў збудаванні мастоў на вялікіх рэках, Але галоўная ўдача фільма — гэта галерэя яркіх характараў, своеасаблівых, непаўторных людзей, нашых сучаснікаў, жыццё якіх звязана з нялёгкім, але цікавым жыццём вялікага калектыву будаўнікоў.

Нашу кінастудыю ў свой час не раз дакаралі ў тым, што яна мала выпускае кінакамедый, што гэты любімы гледачамі жанр недастаткова выкарыстоўваюць у сваёй творчасці нашы рэжысёры. Леташні год стаў пераломным. Створана сем кінакамедый.

У фільме «Зялёны агеньчык» рэжысёра Вілена Азарава вельмі цёпла і лірычна расказана пра першы рабочы дзень шафёра таксі, які пасля сканчэння школы пачаў свой працоўны шлях. У карціне здымаліся маладыя акцёры Аляксей Кузняцоў і Святлана Савелава.

Рэжысёр Генрых Габай стварыў сатырычную кінастужку «Лебедзеў супраць Лебедзева» па сцэнарыі Фелікса Міронера. Фільм не толькі вызначаецца высокім прафесіяналізмам і тонкасцю ігры акцёраў, каштоўнасць яго, як мне здаецца, яшчэ ў тым, што ён востра высмейвае перажыткі ў свядомасці сучаснага чалавека, якія часам вельмі перашкаджаюць яму жыць і працаваць. Фільм нагадвае пра неабходнасць духоўнага і маральнага ўдасканалення чалавека.

Вельмі паспяхова працягвае выступаць у жанры камедыі рэжысёр Георгій Данелія. За параўнальна кароткі тэрмін ён стварыў ужо другую кінакамедыю. Толькі што зняты ім фільм «Трыццаць тры» — дасціпная, смешная стужка. Рэжысёр востра высмейвае шкодную шуміху і сенсацыйнасць, якая часам узнікае навокал ўсялякіх дробязей. Майстэрства рэжысёра і таленавітая ігра выканаўцы вядучай ролі акцёра Яўгена Ляонава ўзнімаюць гэты фільм на ўзровень твораў, якія маюць вялікую сілу абагульнення.

Асобна хачу падкрэсліць, што ў плане мінулага года ў нас вялікае месца было адведзена карцінам, прысвечаным знамянальным датам у жыцці нашай краіны — пяцідзесяцігоддзю Савецкай улады і стагоддзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Разам з польскімі кінематаграфістамі рэжысёр Сяргей Юткевіч завяршыў работу над карцінай «Ленін у Польшчы». У ёй апавядаецца пра жыццё і дзейнасць Леніна напярэдадні і ў пачатку першай сусветнай вайны, калі Ленін жыў паблізу Кракава. Выступаючы супраць сусветнай імперыялістычнай вайны, ён кіраваў рэвалюцыйным рухам, які разгараўся ў Расіі, вызначаў шляхі ажыццяўлення сацыялістычнай рэвалюцыі.

Сяргей Юткевіч, як вядома, стварыў рад карцін пра Ул. І. Леніна ў садружнасці з такім выдатным савецкім акцёрам, як Максім Штраух. У новым фільме артыст зноў выступіў у ролі Леніна надзвычай смела і таленавіта. Уся карціна здымалася ў Польшчы, на месцах гістарычных падзей, што надае ёй вялікую праўдзівасць.

Першы ў гісторыі кінематаграфіі фільм пра Карла Маркса — заснавальніка навуковага камунізма паставіў рэжысёр Рыгор Рашаль. Падзеі гэтай шырокафарматнай карціны адбываюцца ў 1848 годзе, калі ў Еўропе развіваліся рэвалюцыйныя падзеі. Фільм таму і называецца «Год, як жыццё». Іменна тады Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс ствараюць славуты Камуністычны маніфест, які стаў магутнай зброяй рэвалюцыйнай барацьбы за вызваленне рабочага класа. У ролі маладога Маркса выступае артыст тэатра «Сучаснік» Ігар Кваша. Ён стварае пераканальны, праўдзівы вобраз вялікага рэвалюцыйнага барацьбіта і мысліцеля. Ролю Жэні Маркс выканала Руфіна Ніфантава. У ролі саратніка Маркса—Фрыдыха Энгельса зняўся малады артыст Маскоўскага тэатра сатыры Андрэй Міронаў.

«Мы — рускі народ» — яшчэ адзін шырокафарматны фільм на гісторыка-рэвалюцыйную тэму. Паставіла яго Вера Строева. У фільме раскрываецца роля рускіх камуністаў, якія змагаліся ў перыяд першай сусветнай вайны ў радах арміі на фронце за згуртаванне рабочых, салдат і працоўных сялянскіх мас, за рэвалюцыйнае ператварэнне Расіі.

Гераічнаму жыццю і барацьбе нашага камсамола ў гады грамадзянскай вайны прысвечаны фільм «Праз дваццаць гадоў», пастаўлены рэжысёрам Аідай Манасаравай па вядомым творы паэта Міхаіла Святлова.

Асабліва хочацца адзначыць карціну «Час, наперад!» У ёй рэжысёр Міхаіл Швейцар узнаўляе атмасферу першай пяцігодкі і барацьбы моладзі за ператварэнне нашай, у мінулым адсталай сялянскай краіны ў магутную індустрыяльную дзяржаву. Падзеі разгортваюцца ў самым пачатку трыццатых гадоў на працягу аднаго дня на будаўніцтве Магнітагорскага металургічнага камбіната. Рэжысёру разам з аўтарам аднайменнага рамана Валянцінам Катаевым удалося перадаць гарачы душэўны ўздым, палымяны баявы дух маладых будаўнікоў.

Сучаснае жыццё нашай краіны, яе багацейшая рэвалюцыйная гісторыя даюць нам, кінематаграфістам, невычэрпны матэрыял для творчасці. Мы і ў далейшым будзем дамагацца ў сваіх творах галоўнай мэты — глыбіні пастаноўкі маральных праблем, высокай грамадзянскасці, паказу вялікіх, цікавых чалавечых характараў.

Уладзімір СУРЫН,
генеральны дырэктар кінастудыі «Масфільм»

(АДН).

Гарачая пара ў студэнтаў-завочнікаў Маладзечанскага музычнага вучылішча. Рабочыя, служачыя з многіх раёнаў рэспублікі прыехалі на зімовую сесію. Гэты здымак зроблен нашым фотакарэспандэнтам Ул. Крукам на дырыжорска-харавым аддзяленні. Педагог Эльвіра Макарава займаецца з выкладчыкам спеваў 9 слуцкай школы Іванам Расіга.

КАБ КВІТНЕЎ НАШ КРАЙ САДАМІ

У многіх клубах і дамах культуры Віцебскай вобласці аформлены стэнды і фотамантаж на тэмы— «Ахова прыроды — усенародная справа», «Лес — наша багацце», «Квітней, наш край, садамі» і інш.

Абласная бібліятэка імя Ул. І. Леніна разаслала ва ўсе масавыя бібліятэкі тэматычныя распрацоўкі — «Вывучай і любі свой край», «Прырода Віцебшчыны». Дзіцячая абласная бібліятэка імя Н. К. Крупскай правяла ў піянерскім лагеры «Лясная паляна» карнавал, прысвечаны прыродзе роднага краю. Тут была афармлена выстаўка, якая называлася «Пісьменнікі і мастакі аб прыродзе».

Умела вядуць работу па выхаванню любві да роднай прыроды работнікі Гарадоцкай, Суражскай, Ушацкай і Азярышчанскай дзіцячых бібліятэк. Тут рэгулярна арганізоўваюцца літаратурныя вечары, бібліяграфічныя агляды, віктарыны.

АРХІЎНЫЯ ЗНАХОДКІ

Звесткі з біяграфіі Яна Чачота

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР, у фондзе Мінскага губернскага дэпутацкага сходу, знойдзена справа аб дваранскім паходжанні роду Чачотаў.

Іван Фадзеевіч Чачот — Ян Чачот — ураджэнец Навагрудскага павета. У адным з дакументаў указана, што Іван-Антон Чачот нарадзіўся 17 ліпеня 1796 года, хрысціўся ў Варончанскім касцёле Навагрудскага павета. Тут жа захоўваецца дакумент, выдадзены калежскаму рэгістратару Івану Чачоту ад 10 студзеня 1834 года аб наданні яму чына губернскага сакратара.

Два пасямейныя спісы дваран Чачотаў складзены самім паэтам у 1840 і 1842 гадах.

У імянным спісе роду Чачотаў ад 11 лістапада 1840 года Ян Чачот піша пра тое, што «яму сорак пяты год ад нараджэння» і што «жыве ён у маёнтку Шчорсы Навагрудскага павета ў графа Храбтовіча».

У спісе, складзеным паэтам 5 лютага 1842 года, ён піша, што яму сорак шосты год ад нараджэння і што жыве ён там жа, у маёнтку Шчорсы. Ян Чачот працаваў бібліятэкарам у графа Храбтовіча.

Захаваўся запіс аб тым, што ўказам Сената ад 21 кастрычніка 1840 года Іван Чачот, які служыў пісьмавадзіцелем сістэмы Бярэзінскага канала, узведзены ў чын калежскага сакратара.

У рапарце ад 6 лістапада 1857 года Пётр Чачот, брат паэта, піша пра смерць Яна Чачота ў 1847 годзе.

Перапіска аб дваранскім паходжанні Чачотаў, пачатая ў 1815 годзе, заканчваецца 1860 годам.

Я. БРАВЕР,
старшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР.

На гастролі ў Мінск прыехалі папулярныя артысты савецкага цырка Юрый Нікулін і Міхаіл Шуйдзін. У праграме іх выступленняў — цікавыя і змястоўныя інтэрмедыі. Гастролі артыстаў працягнуцца месяц.

На здымку — выступае заслужаны артыст РСФСР Ю. Нікулін.
Фота Э. ТРАГУБОВІЧА.

У Палацы культуры Мінскага трактарнага завода выступіў самадзейны калектыў Магілёўскага завода штучнага валакна—агіттэатр мініяцюр «Усмешка». У ім прымаюць удзел прадзільшчыкі, прыбарысты, і іншыя рабочыя і служачыя завода, а таксама навучэнцы Магілёўскага культасветвучылішча.

Учора з іх выступленнем па Мінскім тэлебачанні пазнаёміліся гледачы рэспублікі.

На здымку вы бачыце фінальную сцэну з выступлення агіттэатра «Усмешка».

ШУКАЕ УЛЬТРАГУК

— Сёння, — сказаў архітэктар Алег Пруцын, — я спадзяюся атрымаць адказ на вельмі цяжкія пытанні.

Ён спыніў сваю «Волгу» на Краснай плошчы Масквы, ля сабора Васілія Блажэннага. Адчыніўшы багажнік, Пруцын дастаў з яго цяжкі шэры чамадан — ультрагукавы апарат, маток проваду і пакінуў ля сцяны агароджы.

...Удзельнічаючы ў рэстаўрацыі храма Васілія Блажэннага, А. Пруцын яшчэ дзевяць гадоў назад звярнуў увагу на адну неадпаведнасць: на ўсходняй грані паўночна-ўсходняга стаўпа была фрэска XVII стагоддзя, напісаная тэмперай, а побач — паўднёва-заходняя частка ўсходняга стаўпа была чамусьці распісана маслам. Мастацтвазнаўцы датавалі роспіс XVIII стагоддзем. Пад маслам, напэўна, хавалася больш старажытная фрэска. А. Пруцын хацеў высветліць, ці так гэта. Але ў тую пару ён яшчэ не валодаў метадам распазнавання ўзросту цэглы, белага каменя, дрэва, фрэскавага грунту. Цяпер ён вярнуўся ў храм Васілія Блажэннага, каб даследаваць роспіс стаўпа.

Адкінута вечка шэрага чамадана. Відзён экран асцылографа. Вучоны прыставіў да ледзь прыкметных кропак, нанесеных ім на фрэску, металічныя цылінды — шчупы, падключаныя да апарата. Нябачныя разведчыкі — ультрагукавыя хвалі — скіраваліся ў глыбіню пласта фрэскі. Па іх вяртанне паведаміла зеленаватая крывая на экране. Па кропках перасячэння з прамой, якая падзяляе экран папалам, вучоны ўстанавіў, што пад масляным жывапісам знаходзілася фрэска — аднагодка той, што была на суседнім стаўпе.

Кожнае адкрыццё старажытнай фрэскі, якіх засталося не так ужо многа, — вялікая падзея. Часцей за ўсё гэта бывала справаю выпадку. Цяпер на дапамогу мастакам - рэстаўратарам і мастацтвазнаўцам прыйшоў ультрагук.

Падклет ёсць пад падлогаю кожнай царквы. У храме Васілія Блажэннага іх столькі ж, колькі ў яго купалаў. У падклетах музейныя работнікі захоўваюць экспанаты тэматычных выставак.

Цагляная сцяна, да якой мы падышлі, ужо вызвалена ад атынкоўкі. На сцяне з'яўляецца ўмоўная сетка — кропкі, расстаўленыя ў пэўным парадку. Зялёным святлом зэяе экран асцылографа.

Скончыўшы даследаванні, А. Пруцын гаворыць:

— Гэта цагляная кладка адносіцца да куды больш раннага перыяду. Можна меркаваць, што некалі на Краснай плошчы ўжо стаяла царква. Барма і Постнік не сталі яе разбураць, а ўбудавалі ў цудоўны ансамбль.

Генрыета АЛАВА.
(АДН).

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ЗА РУБЯЖОМ

Гогаль у Лондане

«Я сабраў вас, панове, з тым, каб паведаміць вам вельмі непрыемную вестку». У англійскім перакладзе гэтая фраза гогалеўскага гараднічага пачынаецца словам — «джэнтльмены». Спачатку звычайны англійскі зварот гучыць дзіўна ў прымяненні да «свіных рылаў», якія дзейнічаюць на сцэне. Але хутка захоплены п'есаю, цудоўнай ігрою артыстаў забываеш, што глядзіш «Рэвізора» на чужой мове.

Так было ў тэатры «Олдвіч», дзе Каралеўская шэкспіраўская трупа паказала 12 студзеня прэм'еру неўміручай гогалеўскай камедыі. Новы пераклад «Рэвізора» выкананы Эдвардам Маршам пад рэдакцыяй Джэрэмі Брукса. Перакладчык знайшоў англійскія эквіваленты і для «свінні ў ярмолцы», і для «пратабэстый», і для «архімахляроў марскіх», прычым танія эквіваленты, якія выклікаюць выбухі смеху ў зале. Смех і апладысменты чуліся на працягу ўсяго дзеяння.

Пастаноўшчык Пітэр Хол вырашыў п'есу адзіна правільна — у плане сацыяльнай сатыры, у сапраўды рэалістычным стылі. Цікава, што Хол зменшыў сцэнічную пляцоўку, што дазволіла яму дамагчыся многіх эфектных мізансцэн.

У п'есе заняты ўвесь цвет Каралеўскага шэкспіраўскага тэатра. Праслаўленая англійская трупа паказала першакласную ігру.

І, вядома, гаворачы пра ігру артыстаў, трэба асобна сказаць пра Поля Скофілда. Стваральнік трагічных шэкспіраўскіх вобразаў Гамлета, Ліра, Цімона Афінскага, ён менш вядомы як камічны акцёр. Аднак у рэпертуары Скофілда — бліскуча выкананая роля Лючыо ў «Меры за меру». Камічны талент Скофілда цалкам раскрыўся ў ролі Хлестакова.

Англійскі друк дае захапляючыя рэцэнзіі на прэм'еру «Рэвізора». «Усё разам было трыумфам», — піша «Дэйлі тэлеграф», адзначаючы, што на англійскай сцэне «Рэвізор» — «ніколі не быў пастаўлены з такім бляскам». («Рэвізор» ставіўся ў Англіі неаднаразова). Тэатральны крытык «Дэйлі скетч» падкрэслівае, што такога камічнага вобраза, які стварыў Скофілд, Лондан не бачыў «з таго часу, як Чаплін насіў свой нацялок». Рэцэнзент «Файнэншл таймс» называе спектакль «самым захапляючым камічным паказам, які я толькі памятаю за апошні час».

Праз сто трыццаць гадоў пасля першай пастаноўкі на чужой зямлі «Рэвізор» даказаў сваю неўміручасць. Авацыю ў канцы спектакля наладзілі не проста аматары пасмяяцца і заўзятыя тэатралы. Я ўпэўнены, што славутае «З чаго смеяцеся? З сябе смяяцеся!» — прымусіла задумацца не аднаго гледача ў лонданскім тэатры «Олдвіч».

Сяргей ІВАНОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

АДРАДЖЭННЕ КАРЦІНЫ... СКУЛЬПТАРА

Аноўчы ў Дзяржаўны музей А. В. Суворава ў Ленінградзе прыйшла жанчына. Яна прынесла карціну, на якой быў паказан эпізод з баявых эпізодаў Айчыннай вайны 1812 года. У левым кутку карціны стаяла: «М. О. Мікешын. 1856 г.».

Цяпер, калі называецца імя М. О. Мікешына, мы ўспамінаем, перш за ўсё, яго цудоўныя скульптуры, што прынеслі мастаку сусветную славу: «Тысячагоддзе Расіі» ў Ноўгарадзе, помнік Кацярыне II у Ленінградзе, Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве, Кузьму Мініну ў Горкім. Мікешын—адзіны з рускіх скульптараў быў запрошаны ўдзельнічаць у міжнародных конкурсах на праекты манументаў Аўрааму Лінкольну ў Вашынгтоне, Адаму Міцкевічу ў Варшаве, Жанне д'Арк у Парыжы. І вось новая сустрэча з Мікешыным-жывапісцам, з яго карцінай «Подзвіг батарэі палкоўніка Нікіціна пад Красным».

Міхаіл Осіпавіч Мікешын напісаў яе па заказе дачкі героя Айчыннай вайны палкоўніка Нікіціна—Е. А. Арловай-Дзянісавай. Тады 19-гадовы жывапісец быў вучнем батальнай майстэрні Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. На наступны год карціна выйшла ў «вялікі свет». Акадэмія арганізавала ў Пецярбургу выстаўку твораў сваіх выхаванцаў. Віднае месца на ёй заняла карціна Мікешына. Акадэмія ўдастоіла яе аўтара вялікага сярэбранага медаля. А герой карціны—палкоўнік Нікіцін у знак удзячнасці падарыў мастаку свой літаграфаваны партрэт з надпісам.

...Лістападаўская раніца. Свінцова-чорныя хмары і дым пажарышчаў ахуталі зямлю. Сіратліва стаяць скалечаныя снарадамі дрэвы. На полі — разбітыя гарматы, забітыя, параненыя. І як песня мужнасці — героі-артылерысты на фоне гэтага сумнага пейзажу. Пакінуўшы гарматы, на ліхіх конях імкліва нясуцца яны ў атаку на напалеонаўскую гвардыю, якая ўсё яшчэ спрабуе ўтрымаць важны стратэгічны пункт — горад Красны. Упераздзе — палкоўнік А. П. Нікіцін з шабляй у руцэ. Рускія не хацелі, каб снарады разбурылі горад. Вось чаму салдаты-артылерысты і пайшлі ў кавалерыйскую атаку...

За сто гадоў вандраванняў карціна пацямнела, пабляклі фарбы, пажаўцеў лак, месцамі парвалася палатно. Вядомы савецкі мастак-рэстаўратар Б. М. Шахаў вярнуў ёй маладосць.

ТАСС.

МАЗАІКА З ТУФУ

Бяздзейны цяпер вулкан Арарат надарыў зямлю Арменіі незлічоным багаццем рознакаляровых каменняў. З іх былі пабудаваны надзвычайныя манастыры і замкі, а цяпер цудоўныя каменні ўпрыгожваюць гарады і вёскі рэспублікі і многія вялікія збудаванні Савецкага Саюза Але каменні— не толькі будаўнічы матэрыял. Сёння з іх выробляюцца дэталі машын, фарбавальнікі, штучнае валакно і многае іншае.

Арыгінальнае прымяненне самаму распаўсюджанаму ў Арменіі каменю-туфу знайшоў Альберт Хачатран, выпускнік Ленінградскага вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча імя В. Мухінай. Яшчэ будучы студэнтам, ён марыў стварыць мазаіку з туфу. З Арменіі былі прысланы каменні, якія ён выкарыстаў для дыпломнай работы. Мяркуемым аб'ектам быў будынак павільёна Армянскай ССР на ВДНГ ў Маскве.

На мазаічным пано з рознакаляровага туфу Хачатран паказаў працаўнікоў, плён працы якіх экспануецца на выстаўцы. Спроба маладога манументаліста выкарыстаць туф у мазаічным пано ўзнячалася поспехам. Розныя адценні каменю дазволілі мастаку дасягнуць каларыстычнага багацця ў мазаіцы. Дыпломная работа атрымала ўсеагульную ўхвалу і была ацэнена на «выдатна».

Першай работай Хачатрана пасля дыплома з'яўляецца мазаічнае пано ў новым Палацы культуры Ерэванскага завода сінтэтычнага каўчуку імя Кірава. Яно размешчана ў авальнай нішы, што знаходзіцца ў самым цэнтры вялікага вестыбюля. Тэма твора традыцыйная ў армянскім мастацтве: мазаіка адлюстроўвае дзяўчыну з алянём. Але старую тэму мастак вырашыў арыгінальна, не паўтараючы ўжо знойдзеныя кампазіцыі.

Адзін і той жа матэрыял у творах маладога армянскага мастака ў залежнасці ад характару тэмы і вобразнага вырашэння набывае рознае гучанне. Камень, з якога ў дыпломнай рабоце створаны мужныя, гераічныя вобразы людзей працы, тут атрымлівае лірычнае гучанне.

Выкарыстанне багатай палітры армянскіх каменняў не толькі ў будаўніцтве нашых архітэктурных збудаванняў, але і для іх упрыгожання мае вялікія перспектывы.

Генрых ІГІЦЯН,
мастацтвазнаўца.

(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 студзеня

Першая праграма. 11.00—для вучняў другой змены. Школьная фільматэка. «Павел Карчагін». Мастацкі фільм. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Гном» (М). 18.00— тэлевізійныя навіны. 18.20 — майстры мастацтваў. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Кумельскі. 18.45 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 19.40 — В. Шоу. «Вучань д'ябла». Спектакль Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 22.10 — «Маленькія хітрыкі». Бытавыя парады.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Увага, якасць!» (М). 18.45 — для школьнікаў. «Юныя ленінцы». Дакументальны фільм. 19.40—рэклама, аб'явы. 19.45— «Песні Верхавіны». Фільм-канцэрт. 20.50 — «Каралева бензаколонкі». Мастацкі фільм. 22.10 — «Рамэн Ралан і музыка» Перадача з Ленінграда.

29 студзеня

Першая праграма. 12.00 — І. Пейчаў. «Кожны восеньскі вечар». Тэлевізійны спектакль. 15.25 — праграма перадач. 15.30—для школьнікаў. С. Міхалкоў. «Вясёлы сон». Тэлевізійны спектакль (М). 17.00 — «Забаўныя цацкі». 17.10—«Вам, перадавікі вытворчасці». Канцэрт-прывітанне. 17.50 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Чатыры бландзінкі, чатыры брунеткі». Музычная перадача. Трансляцыя з Таліна. 19.00 — насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Катоўскі». Мастацкі фільм. Вытворчасць Алма-аціцкай кінастудыі. 20.20 — тэлевізійныя навіны (М). 20.50 — канцэрт, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Р. Ралана (М). 22.20 — «На агеньчык» (М).

Другая праграма. 17.00—«Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — для дзяцей. «Ошь у космасе». «Каралева—зубная шчотка». Мультыплікацыйныя фільмы. 19.00— «Дзе ты цяпер, Максім?» Мастацкі фільм (М). 20.20— наш кінаглобус. «38 мінут у Італіі». «Добры дзень, Кенія!». Кінанарысы. 21.15— «Будзьце вясёлыя». Фільм-канцэрт.

30 студзеня

Першая праграма. 9.35 — праграма перадач. 9.40 — музычная шкатулка. Ранішні канцэрт. 10.00 — «Будзільнік» (М). 10.30 — «Востраў памылак». Мультыплікацыйны фільм (М). 11.00 — «Песні-маршы». Перадача з Югаславіі. 11.40 — «Кіеўскія чараўнікі». Перадача з Кіева. 12.10 — для дзяцей. Беларускія пісьменнікі. «Кандрат Крапіва». Літаратурная перадача. 13.10 — «Белыя і чорныя». Шахматна-шашачны клуб. 13.40 — сельскі клуб «Поры года». Уключэнне Мінска (М). 14.40 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Салдат заўсёды салдат» (М). 15.40 — «Наследнікі». Кінанарыс пра прызыўнікоў-беларусаў. 16.15 — міжнародны атлетычны матч. Перадача з Палаца спорту (М). 17.15 —календар-віктарына. Пра жыццё і творчасць выдатных дзеячоў літаратуры і мастацтва, юбілей якіх адзначаецца ў студзені. 18.30 — «Святло і цені» (М). 19.00 — канцэрт народнай харавой капэлы сяла Лебедзева Маладзечанскага раёна. 19.25 — «Святло далёкай зоркі». Мастацкі фільм. Першая і другая серыі. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 21.45 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 12.10 — «Навіны дня». Кінанарыс (М). 12.20 — «Рабі з намі». Перадача з ГДР. 13.00 — для юнацтва. «Жыццё, мары, прызванне». Перадача з Адэсы. 13.40 — «Атэстат сталасці». Мастацкі фільм. 15.10 — «Хлопцы з металургічнага». Дакументальны фільм. 15.40 — «Музычны кіёск» (М). 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.15 — «Малахітавая шкатулка». Тэлевізійная пастаноўка. 17.10 — рэклама, аб'явы. 17.15 — «Пошукі жар-птушкі». Кінадэбюты маладых. (М). 18.30—для тых, хто любіць спорт. «Шлях да аднаго гола», «Трыумф савецкіх баксёраў». Дакументальныя фільмы. 19.00 — вечар паэта-песенніка Л. Ашаніна (М). 20.15 — праспект маладосці (М).

ВЕЧНАЕ МАСТАЦТВА

НОВАЕ Ў САВЕЦКАЙ ДЫВАНОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Сучаснасць унесла істотныя карэктывы ў жыллёвы інтэр'ер. Час выцясніў з яго грувасцкую мэблю з аляпаватай разьбой, карункавыя пакрывалы і вышытыя вырабы на сценах. Але законы моды не закранулі, аднак, дываноў. Іх вечныя эстэтычныя вартасці вытрымалі выпрабаванне часам і зацвердзілі іх «права быць» у сучасным жыллі.

Дываны не толькі ажыўляюць абстаноўку кватэры і служаць дэкаратыўным упрыгожаннем, але і нясуць эстэтычную нагрузку, уздзейнічаючы на мастацкі густ чалавека. Якімі ж павінны быць дываны, каб адпавядаць свайму прызначэнню?

Гэта і многія іншыя пытанні, звязаныя з развіццём савецкай дывановай вытворчасці, абмяркоўваліся нядаўна ва Усесаюзным інстытуце асартыменту вырабаў лёгкай прамысловасці (УІАЛегпроме).

Савет трымалі відныя савецкія мастакі і архітэктары, мастацтвазнаўцы, хімікі і тэхнолагі, работнікі навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, прадстаўнікі гандлю, якія прыехалі ў Маскву з многіх гарадоў краіны. Удзельнікі мастацкага савета УІАЛегпрома азнаёміліся з эскізамі будучых дываноў і ўзорамі новых вырабаў, прысланых майстрамі дывановай вытворчасці саюзных рэспублік. На суд спецыялістаў прадставілі свае работы рабочыя дывановай вытворчасці Арменіі, рэспублік Сярэдняй Азіі, Прыбалтыкі, Беларусі, Малдавіі, Азербайджана.

Вышэйшую ацэнку журы атрымалі вырабы армянскай фірмы «Айгорг».

Савецкую Арменію па праву называюць рэспублікаю дывановай вытворчасці. У армянскім сховішчы старажытных рукапісаў Матэнадаране захаваліся гістарычныя дакументы, якія сведчаць аб тым, што мастацтва ткацтва дываноў узнікла ўжо больш за дваццаць стагоддзяў назад. Асаблівага росквіту дасягнула яно ў савецкія гады. Разрозненыя арцелі, паўсаматужныя майстэрні аб'ядналіся ў вялікую дзяржаўную фірму, якая мае 12 філіялаў у раёнах традыцыйнага нацыянальнага ткацтва дываноў. Прадпрыемствы фірмы выпускаюць цяпер 20 тысяч квадратных метраў дываноў у год.

Творчасць армянскіх майстроў атрымала шырокае прызнанне не толькі ў СССР, але і за рубяжом. Армянскія дываны, якія вабяць арыгінальнасцю нацыянальных узораў, непаўторным каларытам, былі ўдастоены залатых медаляў многіх міжнародных выставак і кірмашоў, у тым ліку на сусветных выстаўках у Парыжы і Бруселі, на міжнародным юбілейным кірмашы ў Лейпцыгу.

Зарубежныя фірмы праяўляюць вялікую цікавасць да работ армянскіх майстроў дывановай вытворчасці. Сёлета Ерэван наведалі прадстаўнікі гандлёвых кампаній Англіі, Францыі, ФРГ і рада іншых краін, яны заключылі пагадненні з фірмай «Айгорг» на пастаўку армянскіх дываноў.

У творчасці армянскіх майстроў цесна пераплятаюцца багатыя народныя традыцыі і дасягненні савецкага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва. У новых работах армянскіх мастакоў відаць смелыя пошукі каларыту і малюнка.

Арыгінальныя вырашэнні знойдзены армянскімі майстрамі не толькі ў ручным ткацтве дываноў, але і ў вырабах машыннай вытворчасці, у прыватнасці, у дыванах, якія выпускае іджэванскі камбінат—першае ў рэспубліцы прадпрыемства машыннага вырабу дываноў. Магутнасць яго 720 тысяч квадратных метраў дываноў у год. У будучай пяцігодцы сетка дыванаткацкіх прадпрыемстваў значна пашырыцца.

З армянскімі майстрамі дывановай вытворчасці смела супернічаюць і туркменскія майстры. Іх работы вызначаюцца прыгожым строгім малюнкам, спакойным колерам, у якім пераважаюць насычаныя чырвоныя адценні, класічны традыцыйны арнамент. У работах туркменскіх мастакоў нацыянальныя матывы спалучаюцца з пошукамі новых форм. «Рассцілі дыван, і я прачытаю тваё сэрца», — гэтая прыказка, якая нарадзілася шмат стагоддзяў назад, вобразна выказвае тайну мастацтва туркменскіх дываноўшчыц.

Дывановае ткацтва—старэйшы народны промысел Турменіі, ён мае шматвяковыя традыцыі. І ўсё ж не будзе перабольшаннем сказаць, што цяпер ён перажывае сваё другое нараджэнне Адышла ў нябыт праца пры цьмяных свяцільніках, якая толькі знясільвала ткачых. Прасторныя светлыя цэхі Ашхабадскай дывановай фабрыкі абсталяваны сучаснымі высокапрадукцыйнымі станкамі. Тут створан унікальны дыван, які мае 1 мільён 148 тысяч вузлоў на квадратным метры. Тут створаны многія шэдэўры нацыянальнага вырабу дываноў, у тым ліку і сюжэтны дыван «Дружба народаў», які можна ўбачыць у Маскве на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі.

Ашхабадскай дывановай фабрыкай кіруе былая дываноўшчыца Гульджамал Бекдурдыева, якая ўнаследавала майстэрства ткацтва дываноў ад сваёй маці, славутай дываноўшчыцы з Бахардэна. Знамянальны лёс Гульджамал. У сем гадоў яна ўжо выткала мудрагелісты ўзор, у 16 гадоў паступіла ў Ашхабадскі дывановы тэхнікум, а праз некалькі год атрымала дыплом Маскоўскага мастацкага вучылішча.

Дываны Ашхабадскай фабрыкі дэманструюцца на многіх міжнародных выстаўках. Яны экспануюцца ў 50 краінах свету.

Аднадушную ўхвалу журы ў УІАЛегпроме атрымалі выкананыя ў нацыянальным каларыце работы мастакоў Кіраваабадскага дывановага камбіната (Азербайджанская ССР). Летась лепшыя ўзоры азербайджанскага ткацтва дываноў дэманстраваліся на міжнародных выстаўках і кірмашах у Салоніках, Лейпцыгу, Капенгагене.

Цікавымі творчымі пошукамі адзначаны літоўскія дываны: гладкае поле са спакойным рытмам палос або са стылізаваным адлюстраваннем кветак і розных прадметаў на шэрабланкітным або жоўта-карычневым фоне.

Заслужанае прызнанне атрымалі дываны-паласы Малдавіі. Выразна падкрэслены ў іх традыцыйны чорны колер, які аб'ядноўвае ўсю каляровую гаму і надае дыванам асаблівую дэкаратыўнасць.

Шмат добрых работ з арыгінальным вырашэннем малюнкаў раслінных форм паказалі мастакі Маскоўскага дывановавытворчага аб'яднання. Тэкстыльшчыкі Любярэцкага дывановага камбіната, які ўваходзіць у гэта аб'яднанне, працуюць у саюзе з хіміяй. Яны паказалі дываны з сінтэтычным валакном — поліпрапіленам, які валодае трываласцю ў некалькі разоў большай, чым шэрсць, засцерагае дываны ад забруджвання.

У вырабах Нова-Майскай дывановай фабрыкі сама па сабе структура замяняе малюнкі. Дэкаратыўныя па сваёй каляровай гаме, пазбаўленыя арнаменту—аднакаляровыя або двухкаляровыя, з новай, букліраванай паверхняй, яны, несумненна, зойміуць вартае месца ў сучасным інтэр'еры.

Так на змену традыцыйным уваходзяць у савецкае ткацтва дываноў новыя, больш эканамічныя і эфектыўныя ў мастацкіх адносінах матэрыялы, новыя, больш дасканалыя спосабы вытворчасці. У іх, несумненна, вялікая будучыня.

Тамара ЦІХАМІРАВА.
(АДН).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВ